Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 35 (2833) Год LV | Беласток, 29 жніўня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Як кожны год, Святая Гара Грабарка запоўнілася тысячамі вернікаў. Як заўсёды на свята Праабражэння Гасподня з усёй Польшчы прыйшло сюды шмат паломнікаў. Сёлетнія ўрачыстасці у найбольшым праваслаўным санктуарыі мелі адмысловы характар — якраз 300 гадоў таму на Грабарцы здзейсніўся першы цуд.

ТРЫСТА ГАДОЎ ЦУДАЎ НА ГРАБАРЦЫ



Тэкст і фота Міхася СЦЕПАНЮКА

У 1710 годзе на Падляшша нахлынула эпідэмія халеры. Тысячы людзей паміралі ад заразы. Людзі звярнуліся за дапамогай да Усявышняга. Як кажа легенда, старому чалавеку прыснілася, што той, хто прыйдзе на гару Грабарку, уратуецца. Так, дарэчы, і сталася. У жніўні 1710 года на гары сабралася каля дзесяці тысяч людзей. Яшчэ ў той самы месяц узвялі тут драўляную капліцу.

Так выглядаюць пачаткі гісторыі найважнейшага праваслаўнага санктуарыя ў Польшчы. Гісторыі, якую значылі таксама і трагічныя падзеі. Бадай самай страшнай быў пажар царквы ў 1990 годзе. Але зараз, асабліва дзякуючы ахвярнасці праваслаўных вернікаў, гара Грабарка развіваецца.

19 жніўня 2010 года, трыста гадоў пасля першага цуду, на Святой Гары Грабарцы адзначылі свята Праабражэння Гасподня. Галоўную літургію адслужыў ганаровы госць сёлетніх святкаванняў — патрыярх Канстанцінопаля Варфаламей I. Дзень раней патрыярх высвяціў новую царкву ў недалёкіх Сямятычах. 12 гадоў таму прымаў ён удзел ва ўмураванні краевугольнага каменя пад храм.

На свята Спаса на Святой Гары Грабарцы ганаровы госць высвяціў таксама новапабудаваны Дом паломніка.

Як кожны год, так і ў гэты раз на Святую Гару Грабарку прыбылі тысячы праваслаўных вернікаў.

— Мы ўжо немаладзенькія, прыехалі папрасіць, каб Бог даў пажыць у здароўі яшчэ нейкі час, — кажуць мне двое пажылых людзей з Беластока. — Вядома, маліліся мы таксама за дзяцей і ўнукаў.

Кожны, хто прыбывае на гэтае святое месца, з'яўляецца сюды з нейкай мэтай. Адзін — каб падзякаваць Богу за атрыманую ласку ці аздараўленне. Другі якраз для таго, каб гэтае ж аздараўленне атрымаць ці прасіць ласку на наступны год. Шматлікія прыязджаюць на Грабарку рэгулярна штогод.

— Я не ўяўляю сабе, што мог бы не прыехаць на Спаса на Грабарку! — тлумачыць мне мужчына з Кодэня, што непадалёк Белай-Падляскай. — Калі быў крыху малодшы, заўсёды хадзіў у паломніцтвах. Зараз можа крышку менш сілы, таму і прыязджаю на машыне.

Для многіх праваслаўных вернікаў адзінай магчымай формай прыбыцця на Святую Гару Грабарку ёсць удзел у пешых пілігрымках. Паломніцтвы на Грабарку выходзяць з усіх куткоў Падляшша ды Польшчы. З малітвай на вуснах, з рэлігійнымі спевамі ідуць яны нават па некалькі дзён.

— Вельмі файная справа ў час пілігрымкі гэта тое, што людзі дапамагаюць адзін аднаму, — расказвае жанчына з беластоцкага паломніцтва. — Бачаць, што хтосьці мае праблему, не дае рады, хочацца яму піць. Заўсёды ёсць гэтая дапамога.

Як адзначаюць удзельнікі пілігрымак, з якімі размаўляю, у гэтым годзе падарожжа на Грабарку было асабліва цяжкае з прычыны высокіх тэмператур, якія паказвалі тэрмометры ў пачатку тыдня, у якім адзначалася Спаса. Але ўсе згодна гавораць, што варта прыняць удзел у паломніцтве.

— Калі ўжо даходзім сюды пад Гару і бачым купалы царквы, гэтыя дрэвы — чалавек забываецца пра ўсе цяжкасці падарожжа, — кажа мне жанчына, якая прыйшла на Грабарку ў паломніцтве ў сто чалавек з Белай-Падляскай. — Гэта непаўторнае ўражанне. Чалавек тады вельмі ўзрушаны, адчувае вялікую блізкасць з Богам.

Згодна са шматгадовай традыцыяй, людзі нясуць на Грабарку крыжы, якія пасля ставяць навокал царквы. Да гэтага абыходзяць храм тры разы на каленях. Дзякуючы гэтай ахвяры хочуць папрасіць у Бога блаславлення, здароўя ці шчасця ў жыцці, выказваюць удзячнасць за поспехі.

Якраз таму Грабарку называецца „Гарой крыжоў". А крыжоў, а што за гэтым ідзе і просьбаў, на Святой Гары з кожным годам больш. Розныя ёсць і крыжы навокал храма: меншыя, большыя. Часам трапіцца і каталіцкі. Тое, што найбольш лічыцца, гэта ахвяра і тое, што хтосьці прывёз ці прынёс той крыж адмыслова на Грабарку. Таму і дзіўным здалося мне тое, што ў адным з шапікаў побач гары Грабаркі, апрача іконак ды кніжак з праваслаўнай тэматыкай, можна было набыць драўляныя крыжы. Нейкі знак XXI стагоддзя: ахвяру можна купіць побач Грабаркі, не трэба клапаціцца і несці крыжа з хаты. Усё напрасткі!

— Відаць што Грабарка мяняецца, — кажа мне жанчына, якая зараз жыве ў Беластоку, родам з адной з навакольных вёсак. — Калі я была маладая, прыязджалі мы сюды з мамай на возе. Самі вазы тут стаялі, ніводнай машыны. І манашкі жылі вельмі бедна.

Фактычна, з году ў год відаць, што царкоўныя ўлады дбаюць аб тое, каб Грабарка выглядала прыстойна, паколькі з'язджаюцца сюды знакамітыя госці. У гэтым годзе высвячаны быў новы, „іканастасны" можна б сказаць, Дом пілігрыма. Але гэта не канец разбудовы на Грабарцы, аб чым можа сведчыць працяг акцыі „Мая залатоўка на Грабарку".

— Гэта ж праваслаўная Чанстахова, — кажа жанчына з Тарэспаля. — Яна павінна годна выглядаць.

ЗАПРАШЭННІ

Фэст беларускай культуры

„Арлянскія сустрэчы"

пачнецца 29 жніўня 2010 г. у 15.00. на пляцы перад сінагогай у Орлі.

У праграме выступленні калектываў „Церніца" (Мінск), арлянскіх ансамбляў „Арлянскія званочкі", „Арляне", „Вэрвочкі", „Малінкі"ды „Золата" (Бельск-Падляшскі), „Рэчанька" (Козлікі), „Чыжавяне" (Чыжы), „Луна" (Парцава), „Калінка" (Беласток), „Луна" (Беласток). У праграме м.інш.: кулінарная ярмарка, прэзентацыя гмін, вернісаж ніўскага карэспандэнта Міхала Мінцевіча „Адыходзячы свет пасій і прафесій", паказ феерверкаў. Ад 21.00. танцы з гуртом „Метро".

Народны фэст і Свята керамікаў у Старым Ляўкове

пачнецца 29 жніўня 2010 г. у 16.00.

У плане: конкурс лепкі ў гліне ды выступленні калектываў „Цаглінкі" (Старое Ляўкова), „Васілёчкі" (Бельск-Падляшскі), „Луна" (Беласток), „Нараўчанкі" (Нараўка), „Obraz Kontrolny" (Гайнаўка), „Nexx Dance" (Беласток), „АртПронар" (Нарва), „Królik na uwięzi" (Старое Ляўкова), „Archiwum IPM" (Міхалова). Вечарам танцы пад музыку гурта „Axel".

Гайнаўскі дом культуры і Бурмістр горада Гайнаўкі сардэчна запрашаюць на

VI ВЯСЕЛЬНУЮ БЯСЕДУ

якая адбудзецца 29 жніўня 2010 г.

Пачатак у 12 гадзін у гарадскім амфітэатры. З 16 гадзіны вясельныя абрады і традыцыі ў выкананні польскіх і беларускіх калектываў з удзелам публікі, вясельны пачастунак для публікі, вясельная забава.

Сто тысяч

Вось цяпер сапраўды на Беларусі запахла прэзідэнцкімі выбарамі. І справа не ў тым, што ўжо падыходзіць тэрмін пераабрання кіраўніка краіны (нібыта гэтыя тэрміны ўжо не мянялі так, як захочацца існай уладзе). І не ў тым, што безліч апазіцыйных кандыдатаў ужо даўно заявілі, што гатовыя да выбарчага марафона, і іх каманды таксама гатовыя (як дакладваў герой адной кінакамедыі пра гатоўнасць да бітвы: „... коні п'яныя, хлопцы запрэжаныя...". І справа нават не ў тым, што па прагнозах некаторых эканамістаў хутка чакаецца рэзкі абвал беларускай эканомікі, таму ўладзе, нібыта, лепш правесці выбары раней, пакуль ёсць чым выплачваць пенсіі (беспаваротныя абвалы беларускай эканомікі тыя эканамісты прадказваюць кожны год ужо гадоў пятнаццаць запар). І нават паведамленні пра адмену адпачынкаў работнікам міліцыі ні пра што не гавораць (бо яны, работнікі міліцыі, і на рабоце адпачываць умеюць, і пад час адпачынкаў чамусьці любяць прыходзіць на працу).

Галоўная лакмусавая паперка — гэта нязменны на сваёй пасадзе кіраўнік Ліберальна-дэмакратычнай партыі Сяргей Гайдукевіч. Ён нібыта выказаў непакой, што ў будучай прэзідэнцкай гонцы могуць застацца толькі двое, ён і дзеючы кіраўнік беларускай краіны. Астатнія, маўляў, могуць не набраць неабходнай колькасці подпісаў.

У непакой кіраўніка праўладнай партыі неяк не верыцца. І сапраўды, чаго яму непакоіцца? Ды кожны палітык ва ўсім свеце толькі парадавацца мог бы, што большасць яго апанентаў няздольная супрацьстаяць яму. А Гайдукевіч непакоіцца. Не! Тут справа ў іншым. У тыя моманты, калі існая ўлада лічыць немэтазгодным, ці па нейкіх прычынах немажлівым перадаваць нейкае пасланне самой, гэта можа зрабіць нехта іншы. Ну а калі такое пасланне трэба перадаць Расіі, з кіраўніцтвам якой, мякка кажучы, моцна папсаваліся адносіны? Хто яго перадасць?

У Расіі, прыкладам, калі нешта трэба публічна перадаць кіраўніцтву Беларусі, такую ролю выконвае кіраўнік Ліберальна-дэмакратычнай партыі Уладзімір Жырыноўскі. Ён ужо неаднойчы адлюстроўваў псіхічна-эмацыйны стан расійскага кіраўніцтва ў адносінах да беларускага. І хваліў ён беларускага лідэра ўзахлёб, і выказваўся нейтральна, і пра снайпера неяк намякаў. Што загадвалі яму казаць, тое і плёў, мяняючы ўвесь час свае погляды на супрацьлеглыя. Вось і зараз, ва ўнісон з галасамі Пуціна і Мядзведзева, дастаткова жорстка палохаў начальніка беларускай краіны.

А ў Беларусі ролю Жырыноўскага можа выканаць толькі Гайдукевіч. Вось і папалохаў ён рускіх, сказаўшы ім, што колькі б яны не напружваліся з пошукамі замены сённяшняму беларускаму кіраўніку, нічога не атрымаецца. Бо подпісы збяруць, маўляў, па яго словах, толькі двое. Ён, Гайдукевіч, і сённяшні кіраўнік, імя якога ўслых не называецца.

І ў яго словах не так ужо шмат перабольшання. Апазіцыйны блок так і не здолеў аб'яднацца і вылучыць са сваіх колаў аднаго моцнага кандыдата, на якога б працавала ўся апазіцыя. І сёння, з-за гэтага мноства апазіцыйных кандыдатаў ёсць у апазіцыі не толькі да існай улады, але і адзін да другога. Гэта, зразумела, не толькі не спрыяе пашырэнню іх рэйтынгу і вядомасці сярод выбаршчыкаў, але і сапраўды ставіць пад сумнеў мажлівасць збору неабходнай колькасці подпісаў бальшыні з іх.

Шукаць замену існаму прэзідэнту сярод яго атачэння, сярод людзей пры ўладзе, справа хіба што безнадзейная. Сённяшняя беларуская вертыкаль створаная так, што калі хто і выйшаў бы з яе, дык толькі ў апазіцыю. Як самастойная сіла, здольная сабраць сто тысяч подпісаў, гэтыя прадстаўнікі вертыкалі дзейнічаць у прынцыпе не могуць. А ў апазіцыі і так дастаткова былых. Толькі толку з іх не больш, чым як яны былі ў той камандзе.

Ды і не гэта галоўнае ў пасланні, сказаным праз Гайдукевіча. Галоўнае хіба тое, што на сённяшні дзень улада можа, падключыўшы адміністрацыйныя і карныя структуры, прымусіць грамадства не ставіць сваіх подпісаў за тых, за каго ўлада не скажа. І людзі, пад страхам згубіць працу, вучобу, бутэльку або міску бабовага супу не адважацца паставіць свой подпіс.

Віктар САЗОНАЎ

Парадоксы, парадоксы

Ад нейкага часу ходзіць за мною нібы цень паняцце **парадокс**, якое жыве, пакутуе і дзейнічае сярод людзей, ды ёсць парадоксам, што нядрэнна сябе адчувае. А ёсць жа фальшам над фальшамі!

Беручы пад увагу абмежаванае месца, не буду над гэтым распісвацца, толькі выцягну наверх, быццам трусіка з капелюша, мікрапарадокс аб сабе і макрапарадокс — аб смаленскай катастрофе. У маім жыцці гэтых парадоксаў было да чорта і яшчэ пару, але праўдападобна не напісаў бы пра іх, бо чужыя мазалі нікому не баляць і не цікавяць, калі ён нікому непатрэбны. Але ўзнік макрапарадокс, які так ці сяк, але не пакінуў нікога ў свеце абыякавым. Гэта такая трагедыя ў Польшчы, якой ёй не жадаў бы найгоршы вораг. Але пачну з мікрапарадокса.

У канцавым перыядзе маёй службы я апынуўся пад начальствам падпалкоўніка-беларуса, які кіраваў аддзелам па лініі II дэпартамента контрразведкі. Працавалі там палякі, беларусы і „пярэхрысты". Бяру гэта ў двукоссе, бо яны фармальна не парахрысціліся, а толькі ў анкеце падавалі: Polak, Katolik - пішучы гэта з вялікай літары. Значыць, ілгалі... Але я сказаў, што не буду распісвацца, дык не буду. Бо калі б хацеў напісаць, то ў „Ніве" старонак не хапіла б...

Але справа ў тым, што трох з „пярэхрыстаў" вельмі любілі начальніку даносіць на ўсіх, а гадаванцам быў С., бо акрамя службы даносу, удзяляў начальніку сваю кватэру. Быў кавалерам. На мяне таксама даносілі, але начальнік не хацеў займацца прыватнымі справамі, якія б краналі партыйныя справы, і я спакойна працаваў, аб нічым не ведаўшы. Аж чорт надаў выбары да партыйных улад. Калі пачалі падаваць кандыдатаў да ўлад, падпалкоўнік падаў свайго С., а я Францішка Б. Арганізацыя „Эса" адкінула, а Ф. Б. выбрала. Тады мой шэф сказаў мне, што гэтага не забудзе. І не забыўся. Апрача таго, што не даў мне „відэлкаў" і ніякае адправы, то і нават на развітанне не прыйшоў, калі я адыходзіў у запас.

Пасля здарылася так, што ягоны гадаванец абліў яго, свайго прынцыпала, памыямі не да змыцця, і дружба абярнулася ў смярдзючую пляму. А я пачаў атрымліваць паштоўкі з розных месцаў, куды выязджаў мой вораг, і нават з Масквы прыйшла да мяне ад яго касета з надрукам: „Здравствуй, дорогой Друг".

Прыйшоў час, што „мой" падпалкоўнік памёр. Я атрымаў тэлефон з Варшавы: *Drogi braciszku, zmarł mój kuzyn, a twój były szef. Ja, ani moi bracia nie możemy pojechać na pogrzeb. Bardzo cię proszę, abyś wziął udział w pogrzebie jako mój plenipotent: złożysz synom kondolencje, kupisz wieniec... — Tak, ale ja jutro zabieram żonę ze szpitala, która jest po zawale i muszę się nią opiekować. — To jest paskudna sytuacja. To w takim razie załatw wieniec i dostarcz go do domu pogrzebowego, złóż kondolencje i wracaj do żony. Ale bardzo cię proszę o tę przysługę, bo nie mam innego wyjścia.*

Просьбу я выканаў, бо не мог адмовіць сумленнаму чалавеку таго, што для яго важнае. Хаця з неахвотай, бо не забыў подыху шэфа да мяне ў час падлегласці.

А пра макрапарадокс будзе коратка. У час смаленскай, трагічнай для Польшчы, падзеі 10 красавіка расіяне глыбока польскаму народу і ўраду спачуваюць, носяць кветкі на месца катастрофы як сваім найбліжэйшым. Не гавару ўжо пра гэта, колькі матэрыяльных сродкаў каштавала гэта Расію. А тут стараюцца ўсё зрабіць, каб віну за катастрофу і смерць (трагічную, хаця на свой капыл называюць яе геройскай) зваліць на Расію. Але рыба — гэта ўжо такая банальнасць, што аж не хочацца пісаць — пачынае псавацца ад галавы. Папа Ян Павел II, пасвячаючы ў Варшаве помнік акаўцам, не папрасіў фундатараў таго помніка, каб ачысцілі яго з тых элементаў, што пад „крылом" АК палілі, рабавалі і мардавалі наш праваслаўны народ.

Васіль ПЕТРУЧУК

Вачыма еўрапейца

Магу згубіцца

Апошні раз, сеўшы на падсадку, перамяшчаўся я ў час канікул у студэнцкія часы. Здарылася мне гэта зноўку ноччу першага дня сёлетняга „Басовішча", значыць, дабіраўся я такім чынам з Гарадка ў Беласток. Забраў мяне вельмі сіпматычны і крыху гаваркі, ненаймалодшы ўжо славак, вяртаючыся праз Польшчу з Беларусі ў сваю краіну. У Беластоку высадзіў ён мяне на адной з вуліц, затым павярнуў на Варшаву. Нягледзячы на тое, што я нарадзіўся ў Беластоку і з кароткімі перапынкамі жыву тут каля пятнаццаці гадоў і ўвесь час здавалася мне, што прынамсі тапаграфічна ведаю свой горад, то ў тую ноч я зусім адурэў. Спачатку падумаў, што гэта вынік „уражанняў" ад фестывалю музыкі маладой Беларусі і сустрэч ва ўрочышчы Барык са знаёмымі. Азіраўся я наўкол і зусім не мог зарыентавацца, дзе выпусціў мяне са сваёй машыны славацкі шафёр. Азіраюся наўкола, а там усё раскапана: вуліцы, абочыны, а побач нейкія новабудоўлі. Як на злосць, нідзе жывога духу, ані таксі (мой мабільнік, на жаль, разрадзіўся). Пайшоў я тады проста наперад, у бок — як мне інтуітыўна здавалася — нейкіх распазнавальных беластоцкіх месцаў. На шчасце неўзабаве трапіў я на двух маладых людзей, што сядзелі на жалезабетонных плітах і папівалі хмельныя напоі, мабыць, такім чынам нівелюючы стому ад паўднёвай яшчэ спякоты. Спытаўся, дзе тут можна злавіць таксі і дадаў, на якую вуліцу хачу дабрацца. Маладыя людзі глянулі па сабе: „А на які х... табе таксоўка?"

Аказалася, мой дом дакладна ў дзесяць хвілін ад месца нашай размовы. Ішоў я ў той дзень адвячоркам па Рынку Касцюшкі. Зноў, як на працягу ўсяго гэтага лета, пачынаўся якісьці канцэрт. Шматлікія піўныя агародчыкі былі запоўнены з берагамі. Горад жыў. На століку аднаго з піўбараў я знайшоў пакінуты кімсьці шматкаляровы, поўны высакаякасных здымкаў і выдадзены на знакамітай паперы каталог у пяцьдзесят старонак „Białystok 2006-2010". Паказаўся ён дзякуючы канцылярыі беластоцкага прэзідэнта Тадэвуша Трускаляскага. З таго часу, калі назіраю за дзеяннямі беластоцкага самаўрада, значыць, ад пачатку ягонай дзейнасці, такой публікацыі ў канцы тэрміну яго паўнамоцтваў яшчэ не бачыў. Перад сёлетнімі самаўрадавымі выбарамі хваляцца тут гарадскія ўлады м.інш. якраз адноўленым, а ў прынцыпе змененым Рынкам Касцюшкі (называюць яго нават „гарадскім салонам"), перасяленнем помніка Юзафу Пілсудскаму пад Дзяржаўны архіў, павышэннем якасці гарадскога транспарту, паправай бяспекі ці клопатам за культурныя і спартыўныя патрэбы жыхароў. Шмат месца ў каталогу прысвечана Беластоку як лідару ў здабыванні сродкаў з ЕС. Аўтары публікацыі заяўляюць у гэтым кантэксце: „Гэты перыяд быў асабліва важным для нашага самаўрада па прычыне магчымасці здабыцця дадатковых сродкаў з Аперацыйнай праграмы „Развіццё Усходняй Польшчы". Шанц на падобны прагрэсіўны скок, мабыць, паўторыцца няхутка — на шчасце можам ужо сёння сцвердзіць, што быў ён добра выкарыстаны". У гэтым раздзеле я вычытаў, што маё блуканне па вуліцах Беластока ў ноч вяртання з „Басовіча" гэта вынік якраз таго паспяховага выкарыстання цяперашнімі гарадскімі ўладамі, якім неўзабаве скончацца паўнамоцтвы, еўрасаюзных сродкаў. Чытаючы ў гэтым урыўку каталог і слухаючы канцэрт на Рынку Касцюшкі, я падумаў, што я мог бы яшчэ так, як тады, загубіцца, калі б не ветлівыя людзі (як тыя з жалезобетонных пліт), але самі „фешэнебельныя" беластоцкія дарогі давядуць мяне дахаты.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Чэслаў Мілаш — паэт з чысцілішча

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Дэбата ў сейненскай Белай сінагозе

— Сённяшні дзень пачынаў я ад купання ў возеры. З другога боку ўставала сонца. Я плаваў у гэтай сонечнай смузе і спытаўся сам у сябе чыя яна, — так у сейненскай Белай сінагозе, на абшары былога Вялікага Княства Літоўскага, крыху жартаўліва пачаў свае роздумы адзін з самых выдатных паэтаў Беларусі Андрэй Хадановіч у час сустрэчы, якая праходзіла пад лозунгам „Чыім ёсць Мілаш". Адбылася яна дакладна ў шостыя ўгодкі смерці лаўрэата Нобелеўскай прэміі і на год да сотай гадавіны з дня ягонага нараджэння. Сустрэча згуртавала многа выдатных постацей літаратурна-інтэлектуальнага жыцця Польшчы, Літвы і Беларусі.

Да гэтай дэбаты, пры ўдзеле міністра культуры Літвы (першы яго замежны візіт), дайшло па ініцыятыве сейненскага Асяродка „Пагранічча — мастацтваў, культур і народаў", кіраванага Кшыштафам Чыжэўскім. Другая частка сустрэчы — памінальная, пасля польска-літоўскага набажэнства ў Жэгарах, перанеслася на ганак будаванага Міжнароднага цэнтра дыялогу, побач дворыка ў падсейненскай Краснагрудзе, у якім Чэслаў Мілаш у маладосці праводзіў быў канікулы ў сваіх цётак. Адкрыццё Цэнтра мае адбыцца ў рамках святкавання Года Чэслава Мілаша і напярэдадні прыняцця Польшчай старшынства ў Еўрасаюзе. Сустрэчы спадарожнічала выстаўка здымкаў з краснагрудскага дворыка. Адкрывала яе цытата з верша лаўрэата нобелеўскай прэміі „Вяртанне" аб яго вяртанні на старасць у старонкі ВКЛ. Напісаў у ім аб сабе ў апошнім абзацы: „Аднак не адракуся я цябе, няшчасны юнача, і прычын тваіх пакут не назаву дурнымі".

— Пытанне: „Чыім ёсць Мілаш?" мае быць таксама часткова рэфлексіяй над сучасным светам, сённяшнім разуменнем тоеснасці, роднасці, каранёў, — пачынаў дэбату Кшыштаф Чыжэўскі.

Эсэістка ды гісторык літаратуры і ідэі Ірэна Грудзіньска-Грос, падобна як пазней іншыя ўдзельнікі дыскусіі, не сумнявалася: „Гэта правакацыйнае пытанне".

Аднак спрабавала, як і апошнія, знайсці адказ:

— Мілаш у адносінах да самога сябе не прымяняе паняцця эмігрант, толькі выгнаннік. Называў сябе чалавекам звонку. Мілаш не быў чыйсьці, але будаваў нейкую цэласць, нераздзельную і нічыю. Гэта быў вынік будавання злучальнай тканкі.

Працягвала:

— Сённяшні нацыяналізм — моцнае пачуццё нацыянальнасці, аснаванае на выключнасці. Мілаш прапануе пачуццё шматлікасці, разнастайных падвоенасцей (...). Мілаш пытаецца, ці можна сабе ўявіць герояў „Пана Тадэвуша", раздумваючых пра тое, хто яны па нацыянальнасці. Мілаш і Міцкевіч гэта людзі звонку. Яны не толькі эмігранты, але аддзеленыя ад краіны ў часе.

Марэк Залеўскі з Інстытута літаратурных даследаванняў:

— Мілаш існуе ў гістарычнай прасторы, па якой тужым і аб якой час ад часу прыгадваем. Ён супольны, але нейкім чынам чужы.

Войцех Дамаслаўскі, г.зв. мясцовы, звязаны з Асяродкам „Пагранічча":

— Мы з'яўляемся эманацыяй сянкевічаўскай культуры: моцна падзеленыя. Мілаш з'яўляецца быццам бы лінзай, праз якую можна глянуць на нашыя падзелы.

З адважнымі тэзісамі выступіў адзін з самых выдатных польскіх паэтаў і эсэістаў Адам Загаеўскі:

— Калі я прачытаў пытанне: „Чыім ёсць Мілаш?", дык паставіў сабе іншае пытанне: „Што адбываецца з паэтам пасля ягонай смерці і чыім ёсць вялікі паэт пасля смерці?". Мы жывем у перыяд поўнага зацьмення Мілаша ў Польшчы. Год Мілаша набліжаецца ў найгоршы момант. Тыражы тамоў вершаў і эсэ Мілаша невялікія. Ёсць адчуванне, што Мілаш уступіў у літаратурнае чысцілішча. Паэты могуць быць прыняты не толькі інтэлектуальнымі элітамі, але і палітычнымі толькі тады, калі здзейсніцца на іх аперацыя вялікага спрошчвання. Так было з вялікім паэтам Збігневам Гербертам. Такія яго вершы як „Пасланне пана Когіта" не з'яўляюцца простымі заклікамі да дзеяння, яны поўныя таямніцы. На Мілашы такой аперацыі спрашчэння, здаецца, ніхто не хоча правесці.

Дадаў:

— Герберт стаў, на жаль, да пэўнага ўзроўню паэтам „сапраўдных палякаў", а Мілаша — каталіцкага паэта, знянавідзела Радыё Марыя [гэтая радыёстанцыя і яе прыхільнікі абвінавачваюць лаўрэата Нобелеўскай прэміі ў антыпольскасці і супраціўляюцца святкаванню Году Мілаша — М. Х.]. Сваю паэзію збудаваў ён на супярэчнасцях. Адной з іх была такая, што быў ён шукальнікам Бога з левай свядомасцю. І тая жыватворная для яго супярэчлівасць тармозіць гэты ўплыў. Тыя, што ўжо знайшлі Бога, Мілаша ўжо не хочуць. Тыя з лявіцы таксама, бо нашто ім хтосьці, хто шукае Бога? Мілаш з'яўляецца паэтам нічыім, ніхто яго не хоча. Ані тыя ад Бога, ані тыя ад лявіцы.

Іаанна Зах з Ягелонскага ўніверсітэта:

— Уражлівасць Мілаша бярэцца з яго пачуцця адчужанасці. Бесперапынна перакрочваў ён геаграфічныя і цывілізацыйныя межы.

Праф. Альгірдас Авіжэніс, калега Чэслава Мілаша, прафесар Каліфарнійскага ўніверсітэта:

— Ён належаў усім. Гэта відаць, чытаючы яго па-англійску. Кожны, хто прачытаў яго па-англійску, можа лічыць яго сваім.

Эва Заджыньска, аўтарка адукацыйнай праграмы „Паэзія яднае людзей":

— Мілаш — мой. Мой, тады, калі яго чытаю.

Андрэй Хадановіч:

— Чытанне Мілаша вучыць аднаго: пазбягання таго, што раз'ядноўвае, а імкнення да таго, што спалучае. Палякі могуць сказаць, што ён наш, літоўцы могуць сказаць, што ён наш, беларусы, што наш, і патомкі яўрэяў тут пражываючых — таксама. Ёсць адзін бераг ракі, ёсць і другі бераг, але ёсць таксама сама рака. І Мілаш — такая рака, якая яднае. Мілаш гэта паэт з постімперскай свядомасцю, са свядомасцю шматлікіх народаў. Мілаш гэта паэт з іранічным пачуццём паразы, якое належыць кожнаму даросламу чалавеку. У яго выпадку чалавеку, які не можа вярнуцца ў ВКЛ, у айчыну, якой ужо няма.

Літоўскі гісторык Эгідыюс Александравічус:

— Людзі сучаснага нацыяналізму не ўмеюць часта зразумець, што можна быць з рознымі нацыянальнасцямі. У гэтым кантэксце мова не з'яўляецца прыкметай нацыянальнай ідэнтыфікацыі.

Барбара Таруньчык, кіраўнік элітарнага штоквартальніка „Zeszyty Literackie":

— Мілаш як паэт не любіў, каб пра яго гаварылі, што ён чыйсьці. Казаў, што ён належыць Чытачу. Быў ён паэтам і чалавекам публічных спраў пры вострай гістарычнай свядомасці.

Мастак Анджэй Струміла:

— Гэта быў універсальны, татальны чалавек, проста звышчасовы.

У пэўны момант Іаанна Зах уключылася:

— Мілаш меў прароцкую ўяву, як яўрэйскія мудрацы, амаль невыяўную. Ён ведаў, адкуль ідуць пагрозы.

Пасля папулярны пісьменнік Павел Гюле прыгадаў адно здарэнне:

— Мілаш быў, здаецца, адзіным паэтам у гісторыі сучаснай еўрапейскай літаратуры, які напісаў папу [Яну Паўлу II — М. Х.] і паставіў пытанне пра сваю творчасць: ці ягоная творчасць змяшчаецца ў плыні таго, што Касцёл лічыць сваім. Папа адказаў, што змяшчаецца. Чаму ўзнікае такі ліст? Мілаш кажа: мы тут на зямлі чужыя. Паказвае вельмі моцную апазіцыю з натурай, тое, што ў вызначэнні быцця чалавекам натуральным з'яўляецца адчуванне чужасці. Значыць, чыім ёсць Мілаш? Усіх тых, якія з'яўляюцца ерэтыкамі ў экзістэнцыяльным разуменні жыцця і ўсіх, якія да гэтага быту не падыходзяць.

Паэт Тамаш Ружыцкі:

— Праблемай Мілаша была праблема... выгнанніка з раю.

Барбара Таруньчык:

— Ён быў прасякнуты ідэяй прававой дзяржавы, а не прынцыпу „любіце адзін аднаго".

Пры канцы дэбаты Кшыштаф Чыжэўскі сказаў:

— Успрыманне Мілаша, які не даецца заваладаць розным анексіям, з'яўляецца таксама пераадольваннем скутага розуму [гэта спасылка на адзін з вядучых твораў Чэслава Мілаша — „Скуты розум"].

Пад вечар у Краснагрудзе ўдзельнікі дэбаты ўспаміналі лаўрэата Нобелеўскай прэміі і чыталі яго вершы, але таксама, як Павел Гюле і Андрэй Хадановіч [перакладчык Чэслава Мілаша на беларускую мову] — свае. Верш Андрэя Хадановіча, напісаны ў рытме рэпу, выклікаў буру апладысментаў.

— Сваё пісанне трактую як працяг Мілашавай велічнасці мовы, — сказаў Павел Гюле.

Галоўны рэдактар прэстыжнага выдання „Znak" Ежы Ільг:

— Размовы з Чэславам Мілашам патрабавалі вялікага высілку. Быў ён следапытам высілку. Мінае шэсць гадоў ад ягонай смерці і прыгадваецца мне, як яму велічалі ў Кракаве [тады там жыў — М. Х.]. І думаецца мне, што ён адчуваў там сябе самотным.

Італьянскі выдавец і аўтар кніжак аб сучасным мастацтве Раберта Сальвадоры:

— Мілаш быў бы шчаслівым, калі б убачыў гэтае месца [Краснагруду і ваколіцу — М. Х.], якое калісьці раздзялала, а цяпер з'яўляецца месцам пагранічча. Гэтае месца спалучае Польшчу, Літву і Беларусь, паказвае, што і ў Еўропе гэтак быць можа. Тут матэрыялізуецца дух такой Еўропы.



У Краснагрудзе вершы Чэслава Мілаша чыталі м.інш. Андрэй Хадановіч і Адам Загаеўскі

Фэст у Семяноўцы

Летнія фэсты ў Семяноўцы (Гайнаўскі павет) заўсёды ўдалыя. Арганізоўваюць іх штогод у той самы дзень — 9 жніўня. Тады і прыязджае многа людзей — гэта жыхары Семяноўкі і шырокага наваколля, турысты і дачнікі. І надвор'е бывае ласкавае, цёплае.

Гэтак было і сёлета. На выступы прыехалі мастацкія калектывы з Мазыра (Рэспубліка Беларусь), Беластока, Гайнаўкі, Міхалова ды з Нараўчанскай гміны. Ва ўрачыстасці прынялі ўдзел, між іншым, консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Наталля Міськевіч, старшыня Галоўнага праўлення БГКТ Ян Сычэўскі ды радныя Нараўчанскай гміны.Усіх сардэчна прывітаў і зычыў, каб святочны пасляабедні час прайшоў у прыемнай атмасферы войт Мікалай Павільч.

Мерапрыемства пачалося ў 16 гадзін. На пачатку выступіў фальклорны калектыў „Нараўчанкі" з Нараўкі. Канцэрт вяла Кася Бяляўская.

Прыгожымі меладычнымі і жартоўнымі песнямі парадавалі гледачоў „Сакрэт" з Міхалова, „Цаглінкі" са Старога Ляўкова, „Луна" з Беластока і „Гэвэн" з Гайнаўкі. У тым часе Юрый Шыманюк з Семяноўкі прапанаваў са сцэны сваю новавыдадзеную кніжку пад загалоўкам „Piękno Ziemi Narewkowskiej. Współczesność, historia, legendy i mity". Ён расказаў прысутным як працаваў над падрыхтоўкай гэтага выдання, адкуль браў матэрыялы, фотаздымкі, даўнія карты з вёскамі над ракой Нараўкай, як збіраў легенды, ды чытаў цікавейшыя ўрыўкі з кніжкі.

Шматлікая публіка была пад вялікім уражаннем ад выступленняў калектываў „Стрэчанне", „Чараўніцы" і „Сваякі" з Мазыра. Настрой усіх быў радасны і прыўзняты. Хаця канцэрт доўжыўся чатыры гадзіны, у гледачоў не заўважалася стомы, толькі радасць.

Пасля 21 гадзіны шмат маладых людзей засталося на танцавальнай забаве пад музыку гурту „Тройка" з Міхалова.

Чытачы „Нівы" атрымалі кніжкі

Кола чытачоў „Нівы" ўсё больш пашыраецца. Летам гэтага года наш родны часопіс пачалі чытаць, між іншым, Крыстына Бельская, Лідзія Бельская, Валянціна Янель ды Люба і Лявон Кардашы з Тарнопаля, Юлія Бядрыцкая і Ніна Валкавыцкая з Заблотчыны, Міхал Бароўскі са Свінароя ды Надзея Кот з Плянты і Юрка Лукша з Альхоўкі. Больш актыўныя і ў меру сістэматычныя чытачы „Нівы" атрымалі ад рэдакцыі кніжкі. Яўгеніі і Юрку Равінскім са Старога Ляўкова ўручыў я „Крышынкі" Васіля Петручука і Раісе Баканач з Новага Ляўкова — „Гісторыі з белага свету" Міры Лукшы. Такую самую кніжку з аўтографам аўтаркі атрымалі Галіна і Юрка Казлоўскія ды Нэлі Харкевіч з Новага Ляўкова. Міра Лукша перадала кніжку „Шчадруха" Алены Анішэўскай. Кніжкі „Шчадруха" ўручыў я Веры Шыкуле з Гайнаўкі і Галіне Бірыцкай з Плянты, а кніжку пад загалоўкам „Віры" Георгія Валкавыцкага — Валянціне Самойлік з Плянты.

Яшчэ дзве кніжкі „Гісторыі з белага свету" Міра Лукша падпісала Яну Сухадолу з Тарнопаля і Юрку Лукшы з Альхоўкі.

Так вось верныя чытачы „Нівы" могуць пазнаёміцца з кніжкамі беларускіх літаратараў з Беластока і мець іх у сваіх бібліятэчках.

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

НЯМА ЗГОДЫ ПАМІЖ САМАЎРАДАЎЦАМІ І ЭКОЛАГАМІ

У пашыраным Белавежскім парку апынулася б Масева. Жыве ў ім многа старэйшых людзей, сталі пасяляцца прыезджыя. Пасля пашырэння парку прадбачваецца пракладка каналізацыі

У мінулым годзе прадстаўнікі Міністэрства асяроддзя доўга кансультавалі прапановы пашырэння Белавежскага нацыянальнага парку першапачаткова на 20 тыс. га, а пасля на 10 тыс. га на тэрыторыі Белавежскай, Нараўчанскай і Гайнаўскай гмін, а ўзамен прапанавалі 100 млн. зл., у галоўным на праэкалагічныя інвестыцыі ва ўсіх гмінах Гайнаўскага павета, з асаблівым улікам на тры згаданыя гміны. Пасля адстаўкі міністра Мацея Навіцкага размовы страцілі тэмп. Новы міністр Анджэй Крашэўскі абяцаў, што праца па пашырэнню БНП будзе працягвацца. У чэрвені г.г. якраз у Белавежы адбылося выязное пасяджэнне сенацкай камісіі па справах аховы асяроддзя, якая мае вельмі абмежаваныя кампетэнцыі, каб вырашаць пытанні пашырэння БНП. У час сустрэчы прагучала многа крытычных заўваг да міністэрскіх прапаноў, а канкрэтна ўмоў, на якіх мела б адбыцца далучэнне новых тэрыторый да БНП, што моцна ўсхвалявала прадстаўнікоў экалагічных арганізацый, якія сталі заклікаць міністэрства пакінуць ідэю пашырэння парку, а прадугледжаныя 100 млн. зл. кампенсацыі перадаць пацярпеўшым ад паводкі. Гэта выклікала незадавальненне ў мясцовых самаўрадах і такая варожасць магла б працягвацца, калі б не новая прапанова, а хутчэй за ўсё старая ідэя, крыху змененая, якую 2 ліпеня прадставіў у Белавежы міністр асяроддзя Анджэй Крашэўскі на сустрэчы з мясцовымі самаўрадаўцамі.

— Міністр Крашэўскі прапануе нам, каб парк быў пашыраны ў першым этапе на 10 тыс. га, а не на 20 тыс. га, а ўзамен гміны атрымалі б у якасці кампенсацыі 70 млн. зл., а не як першапачаткова прапанавалася 100 млн. зл., — заявіў старшыня Гміннай рады ў Белавежы Ян Гвай. — На тэрыторыі Белавежскай, Нараўчанскай і Гайнаўскай гмін парк меў бы пабольшаць прыблізна пароўну, недзе па звыш 3 тыс. га, а на праэкалагічныя інвестыцыі ў кожную з трох гмін выдзеленых было б па 15 млн. зл. датацый з Нацыянальнага фонду аховы асяроддзя і воднай гаспадаркі. 15 млн. зл. размеркаваны былі б на іншыя гміны Гайнаўскага павета, а 10 млн. зл. можна было б выкарыстаць на ўстаноўку сонечных калектараў для ацяплення дамоў.

Да ўсіх датацый на грамадскія і прыватныя (у выпадку сонечных калектараў) ініцыятывы трэба было б далажыць 15% уласнага ўкладу.

— Трэба выпрацаваць кампраміс, які задаволіў бы абодва бакі. Больш строгая ахова пушчы можа адбывацца ў рамках Дзяржаўных лясоў, але тады людзі не атрымаюць кампенсацыі. Мы ў Нараўчанскай гміне яшчэ раней выдзелілі больш за 3 тыс. га пушчы, на якія мог бы быць пашыраны парк, але канчаткова аб гэтым будзе вырашаць рада гміны. Саставілі мы таксама спіс інвестыцый, якія фінансаваліся б з прызначаных нам 15 млн. зл. Аднак не будзе ніякай згоды на пашырэнне парку, калі ўрадам не будзе падпісана прамеса, якая будзе гарантаваць магчымасць выкарыстання прызначаных нам сродкаў, — заявіў нараўчанскі войт Мікола Павільч.

Жыхары Нараўчанскай гміны помняць міністэрскія абяцанні ад 1996 г., большасць якіх пасля змены ўрада не была здзейснена. Войты Белавежскай і Гайнаўскай гмін таксама лічаць, што падставовай умовай згоды на пашырэнне парку мусіць быць пісьмовая гарантыя атрымання кампенсацыі.

Хаця новую прапанову міністр Крашэўскі агучыў на сустрэчы з самаўрадаўцамі Гайнаўшчыны 2 ліпеня, то толькі 26 ліпеня войты атрымалі канкрэтызаваную на пісьме прапанову паразумення ў справе пашырэння БНП. Самаўрадаўцы мелі неадкладна пераслаць у міністэрства свае заўвагі. Найбольш заўваг прад'явіла Белавежская гміна.

— Мы патрабавалі, каб у паразуменні быў запіс, што не будзе ліквідаванае ніводнае надлясніцтва і не будуць вызваляцца з працы лясныя работнікі. У прапанове даецца гарантыя захаваць месцы працы і надлясніцтвы толькі да 2015 г., але гэта не задавальняе грамадства, — сказаў белавежскі войт Альберт Літвіновіч. — Больш за 3 тыс. га, якія мы прапануем далучыць да парку, гэта перш за ўсё запаведнікі ў Дзяржаўных лясах. Лічым, што яны ў першую чаргу патрабуюць асаблівай аховы. Я не бачу асаблівай карысці ад прапанаваных умоў пашырэння і прадбачванай дапамогі, калі гэта супаставіць з адмоўнымі паслядоўнасцямі пашырэння парку. Менш грошай будзем атрымліваць ад лясных падаткаў і мала фінансавай дапамогі будзем маглі выкарыстаць з-за нястачы сваіх грошай на ўласны ўклад. Людзям не падабаюцца абмежаванні ў выніку штораз больш строгай аховы пушчы.

У пачатку жніўня ў Белавежскую, Гайнаўскую і Нараўчанскую гміны трапіў праект пабольшання БНП на 12 тыс. га, хаця раней кансультавалася прапанова на 10 тыс. га. Астатнія 2 тыс. га гэта ландшафтны запаведнік імя Уладыслава Шафера пры ваяводскай дарозе № 689 Гайнаўка — Белавежа. Менавіта гэтая прапанова, раней не кансультаваная з самаўрадамі, выклікала найбольш крытыкі. Увесь праект паведлічэння парку меў бы рэалізавацца ў рамках Белавежскай праграмы развіцця, які прадбачвае фінансавую падтрымку мясцовага грамадства размерам у 70 млн. зл. і выдзяленне ў Ваяводскім фондзе аховы асяроддзя і воднай гаспадаркі 5 млн. зл. на крэдыты, якія маглі б выкарыстоўвацца ў якасці 15-працэнтнага ўкладу ў праэкалагічныя інвестыцыі. Гэтыя 70 млн. зл. мелі б быць даступнымі пасля афіцыйнай згоды рад трох згаданых гмін, Гайнаўскага павета і радных Ваяводскага сейміка на павелічэнне парку згодна з дасланым праектам. Аднак новым праектам і ходам апошніх размоў незадаволеныя радныя. Найбольш засцярог у радных Белавежскай гміны.

— Я думаю, што большасць радных будзе супраць. Людзі апасаюцца, што дапамога будзе невялікай, што паявяцца вялікія абмежаванні. Міністэрскія чыноўнікі размаўляюць з войтамі, а замала са звычайнымі людзьмі, якія не перакананыя да новых прапаноў, — заявіў старшыня Рады Белавежскай гміны Ян Гвай.

Каб паскорыць працэс пашырэння парку і абмежаваць высечку дрэў на тэрыторыі Дзяржаўных лясоў, маладыя актывісты экалагічнай арганізацыі Грынпіс 11 жніўня развесілі вялікі транспарант на сцяне будынка Міністэрства асяроддзя ў Варшаве з надпісам „Я люблю пушчу" і некалькі дзён пратэставалі. Патрабуюць яны як найхутчэй пабольшыць парк напалову, а пасля і на ўсю Белавежскую пушчу, а не як прапануе міністэрства да 35% яе тэрыторыі ў Польшчы.

Міністр Крашэўскі перад тэлекамерамі сказаў, што ўдалося яму пераканаць мясцовыя самаўрады да прапановы пабольшання парку на 11 600 га. Аднак цяжка быць упэўненым, што міністру ўжо ўдалося пераканаць самаўрадаўцаў да сваіх прапаноў. Эколагі дабіліся таго, што прыблізна на месяц была спынена высечка дрэў у пушчы (да канца перыяду апекі птушак над сваім патомствам). Міністр Крашэўскі меў абяцаць пратэстуючым, што будзе намагацца абмежаваць высечку дрэў у пушчы да колькасці патрэбнай для мясцовага насельніцтва. Затое эколагі заяўляюць, што будуць збіраць подпісы і слаць у парламент грамадзянскі праект навелізацыі закону аб парках, які б дазваляў пашыраць іх тэрыторыю нават без згоды мясцовых самаўрадаў, а толькі пасля кансультацый з эколагамі. Карацей кажучы, няма згоды паміж самаўрадаўцамі і эколагамі, а яна была б у карысць як для мясцовага насельніцтва, так і для аховы пушчы.

Сустрэча ў Таварыстве беларускай культуры

Юрась ЮРКЕВІЧ

У апошнюю суботу ліпеня адбылася традыцыйная сустрэча сяброў Таварыства беларускай культуры ў Вільні. Гэтым разам выступоўцы прысвяцілі свае прамовы знакамітым асобам, што нарадзіліся ці памёрлі ў гэтым месяцы, а таксама важнай гістарычнай падзеі — 600-годдзю Грунвальдскай бітвы. На сустрэчы прысутнічалі госці з Мінска — сябры Брацтва ў гонар Святых мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія Віленскіх пры Свята-Пётра-Паўлаўскім саборы г. Мінска.

Імпрэзу традыцыйна распачаў старшыня ТБК Хведар Нюнька з аповеду пра беларускага паэта, празаіка, публіцыста і мемуарыста Янку Багдановіча (1906-1990). Літаратар Віленшчыны нарадзіўся ў в. Гібінята Валожынскага раёна Мінскай вобласці. Бацькі Янкі загінулі напрыканцы Першай сусветнай вайны і малады Багдановіч выхоўваўся ў дзіцячых прытулках, што былі арганізаваны беларускай інтэлігенцыяй. У 1927 годзе скончыў Віленскую беларускую гімназію, друкаваўся з 1930 г. Янка Багдановіч з'яўляўся адным з выдаўцоў часопіса „Шлях моладзі" ў 1929-1938 гг. Падчас Другой сусветнай вайны вучыўся ў Віленскай настаўніцкай семінарыі. У 1952 годзе Янка паступае ў Нова-Віленскі педагагічны інстытут, аднак ужо праз пару месяцаў яго арыштоўваюць і высылаюць у Варкуту. Скончыць інстытут Багдановічу давялося значна пазней пасля рэабілітацыі ў 1956 г. Усе наступныя гады беларускі літаратар працаваў у школе, адкуль і пайшоў на пенсію. 13 ліпеня 1990 года Янкі Багдановіча не стала.

Сустрэчу працягнуў студэнт Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта Юрась Юркевіч, які распавёў пра Грунвальдскую бітву 15 ліпеня 1410 г. Малады даследчык звярнуў увагу на пэўную ангажаванасць у інтэрпрэтацыі гэтай гістарычнай падзеі ў беларускай гістарыяграфіі. Так, напрыклад, з аднаго боку замоўчваецца правакацыйны характар дзеянняў Вітаўта ў Жамойціі напярэдадні Вялікай вайны, а з другога боку феадальнаму канфлікту сярэдніх вякоў надаецца этнічны характар славяна-нямецкага супрацьстаяння. Юрась Юркевіч звярнуў увагу прысутных на тое, што пасля Крэўскай уніі ордэнская дзяржава незваротна слабела і пакрысе сама схілялася да саюза з ВКЛ.

Студэнт ЕГУ згадаў таксама пра тактычную хітрынку аб'яднаных войскаў — аблуднае адступленне, што праз польскую гістарыяграфію на чале з Янам Длугашам доўгі час разглядалася як „разгром" войска ВКЛ. Насамрэч, гэтая тактыка была пазычаная Вітаўтам пасля паразы ў бітве на Ворскле ў 1399 г. Менавіта такі тактычны крок увёў крыжакоў у зман і прадбачыў перамогу ў Грунвальдскай бітве аб'яднаных войскаў.

Алесь Адамковіч прысвяціў сваю прамову творчасці Алеся Гаруна (1887-1920). Прушынскі Аляксандр (сапраўднае імя паэта) нарадзіўся 11.03.1887 г. у межах сучаснага Мінска — у фальварку Новы Двор. У 1897 г. скончыў гарадскую прыходскую школу ў Мінску.

Выступае Валянціна Трыгубовіч

Алесь Гарун творча дэбютаваў досыць рана ў 1907 г. у „Нашай ніве" вершам „Маці Беларусі". Потым ягоныя творы пабачылі свет на старонках выданняў „Беларус", „Вольная Беларусь", а таксама ў калектыўных зборніках і календарах.

Паэта напаткаў пакручасты лёс рэвалюцыянера. Ужо ў 1904 г. ён уступіў у партыю эсэраў, а ў 1907 г. быў арыштаваны і высланы на пасяленне ў Сібір, дзе займаўся сталярнай і цяслярнай працай. Ссылку адбываў у Кірэнскім павеце Іркуцкай губерні. У Мінск Гарун вярнуўся толькі ў верасні 1917 года. Падчас нямецкай акупацыі беларускі паэт рэдагаваў газету „Беларускі шлях". У 1919 годзе стаў сябрам Беларускай вайсковай камісіі (захавалася фота Алеся Гаруна ў форме БВК разам з Янкам Купалай). Беларускі талент памёр ад сухотаў 28 ліпеня 1920 г. у Кракаве. У 1980-я закінутую магілу на Ракавіцкіх могілках адшукаў беларускі гісторык Алег Латышонак.

Развітальная імша з Вільняй

Алесь Гарун пражыў пакутлівае і змагарнае жыццё за лепшую, вольную Беларусь, і Алесь Адамковіч працытаваў такі напамін паэта:

Ты, мой брат, каго зваць беларусам,
Роднай мовы сваёй не цурайся;
Як не зрокся яе пад прымусам,
Так і вольны цяпер не зракайся.

Крыстына Балаховіч згадала выдатнага беларускага мастака Пётру Сергіевіча (1910-1984). Беларускі талент нарадзіўся паблізу возера Нарач у 1910 г., а ў Вільню трапіў амаль дваццацігадовым юнаком. Пётра Сергіевіч скончыў Віленскі ўніверсітэт, дзе выкладаў прафесар аддзялення прыгожых мастацтваў Універсітэта імя Стэфана Баторыя ў Вільні Фердынанд Рушчыц. Працы мастака былі пазней прадстаўлены на шматлікіх міжнародных выставах.

У міжваенны час П. Сергіевіч быў чальцом Беларускага навуковага таварыства, на грамадскіх пачатках супрацоўнічаў з Беларускім музеем у Вільні, дзе захоўваліся і ягоныя працы.

Пасля вайны больш 40 гадоў беларускі мастак жыў на Антокалі ў двухпавярховым доме, амаль насупраць палаца Сапегаў. Там яго наведвалі выдатныя мастакі Беларусі і Літвы. Маючы за плячыма 74 гады, Пётра Сергіевіч памёр у Вільні ў лістападзе 1984 г., дзе і быў пахаваны на вайсковых могілках.

Напрыканцы сустрэчы Мікола Матрунчык распавёў пра чыннасць Брацтва ў гонар Святых мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія Віленскіх. Пачыналася Брацтва з працы асветніцкай ініцыятывы, калі ў 1989 годзе была створана Біблейская камісія Беларускай Праваслаўнай Царквы па перакладзе Свяшчэннага Пісання на беларускую мову. У 1991 годзе пабачыў свет першы з чатырох Евангелляў — Евангелле паводле Матвея. Пазней былі перакладзены і выдадзены Святое Евангелле паводле Марка (1999 г.); Святое Евангелле паводле Лукі (2002 г.); Святое Евангелле паводле Іаана (2005 г.).

У 2007 годзе супольнасцю быў запісаны аўдыёдыск „Пачуй, Божа, малітву маю!" з богаслужэннямі на беларускай мове. На дыску былі змешчаны малебен і паніхіда з удзелам маладзёжнага хора Свята-Петра-Паўлаўскага сабора, а таксама ранішнія і вячэрнія малітвы, якія чытае протаіерэй Сяргей Гардун. Апошнім стала сёлетняе выданне богаслужэбнага Свяшчэннага Евангелля на беларускай мове.

Пасля сустрэчы сябры Брацтва наведалі Ліпаўскія могілкі ў Вільні, дзе правялі памінальную службу на магіле Лявона Мурашкі. Брацтва ў гонар Святых мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія Віленскіх правяло таксама беларускую службу каля Свята-Духава манастыра ў Вільні. Атрымалася вельмі цёплая сустрэча. Сябры Брацтва высока ацанілі ўклад ТБК у захаванне беларускай духоўнасці і гісторыка-культурнай спадчыны ў Вільні і Літве.

Аб правядзенні IX Міжнароднага маладзёжнага лагера ў Мінску-Мазавецкім

16 жніўня 2010 года ў Мінску-Мазавецкім адбыліся заключныя мерапрыемствы IX Міжнароднага маладзёжнага лагера, у якім прынялі ўдзел навучэнцы гімназій з шасці краін свету: Беларусі, Літвы, Расіі, Польшчы, Украіны і Францыі.

Рэспубліку Беларусь прадстаўлялі навучэнцы з Оршы і Старых Дарог — пераможцы, лаўрэаты і ўдзельнікі шматлікіх конкурсаў па выяўленчым мастацтве.

Удзельнікі лагера два тыдні знаёміліся з гісторыяй, культурай, навакольным асяроддзем Мінска-Мазавецкага, а потым гэта адлюстравалі ў малюнках. Па выніках падвядзення конкурсу беларусы атрымалі ўзнагароды лаўрэатаў конкурсу на лепшае адлюстраванне ў мастацтве гісторыі гэтага рэгіёна Польшчы.

Аб гастрольным туры Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь у Польшчы

У Рэспубліцы Польшча адбыліся гастролі Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь, арганізатарамі якога выступілі Пасольства Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча, Генеральнае консульства Беларусі ў Гданьску, Культурны цэнтр Беларусі ў Польшчы.

У першы дзень гастролей аркестр выступіў у Вейгерове, на якім прысутнічалі тысячы гледачоў, сярод якіх былі прадстаўнікі гарадскіх улад, кіраўніцтва Паморскага ваяводства, прадстаўнікі рэгіянальных органаў улады, парламентарыі, беларусы, якія пражываюць у ваяводстве. Перад пачаткам канцэрта ад імя надзвычайнага і паўнамоцнага пасла Беларусі ў Польшчы Віктара Гайсёнка быў зачытаны прывітальны ліст арганізатарам і ўдзельнікам гастрольнага тура. У першай палове дня ад імя Пасольства, Генеральнага консульства Беларусі ў Гданьску і Прэзідэнцкага аркестра былі ўскладзены кветкі да помніка савецкім воінам, загінуўшым пры вызваленні горада.

15 жніўня калектыў выступіў у Гдыні на галоўнай сцэне курортнага горада, а таксама ў Гданьску, на плошчы каля праваслаўнай царквы св. Мікалая.

16 жніўня ў Слупску канцэрт быў прысвечаны 745-й гадавіне заснавання горада, дзе пражывае вялікая колькасць беларусаў і дзейнічае грамадская арганізацыя „Вільня-Гродна". Завершыўся гастрольны тур канцэртам 19 жніўня ў Гожаве-Велькапольскім.

Выступленне Прэзідэнцкага аркестра ў паўночна-заходнім рэгіёне Польшчы сведчыць аб тым, што Беларусь надае вялікае значэнне развіццю еўрапейскага вектара супрацоўніцтва, аказанню дапамогі суайчыннікам, якія пражываюць у Польшчы. Канцэрт беларускіх артыстаў адкрывае новую старонку ў развіцці культурных сувязей паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча.

www.poland.belembassy.org/bel/news

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)



зорка

для дзяцей і моладзі

„Пачынаецца час шалёных імпрэзак і сустрэч"!

(паводле гараскопа на наступаючы навучальны 2010/2011 год)

Завяршаем друкаваць рэпартажы і фельетоны з Сустрэч Зоркі. Сёлетні плён уражвае якасцю і колькасцю. Ёсць цікавыя адгалоскі. Пад уплывам рэпартажу Сары Кос „Вада гэта жыццё", наш чытач захацеў наведаць урочышча Кудак. Нехта іншы спытаўся: як гэта мачыма, каб дзеці напісалі такія цікавыя і праўдзівыя артыкулы? Аказваецца — магчыма. Самай вялікай перашкодай з'яўляецца недастатковае веданне беларускай мовы, часам трэцюю частку тэксту трэба было перакладаць з польскай і рускай моў. Аказваецца, мала хто ўжо гаворыць пабеларуску з бацькамі, амаль ніхто не чытае беларускіх кніжак. Без гэтай практыкі цяжка самастойна скласці жывы сказ. Ды памянялася самое ўспрыманне газеты. У першы дзень журналісцкіх майстар-класаў мы прапанавалі, каб рэдакцыі самастойна прыдумалі тэмы для сваіх артыкулаў. Нас цікавіла, якія справы, паводле маладога чытача, трэба закранаць і друкаваць у „Зорцы". І пачалося... У першую чаргу, як град пасыпаліся гараскопы, кулінарныя рэцэпты, віктарыны, усякія парады як быць добрым мужам або жонкай. Для сучаснага гімназіста газета явіцца як каляровы часопіс для жанчын, дзе на першым і апошнім месцы мода, сенсацыі і кулінарыя...

Праўда, самі ўдзельнікі паступова пачалі назіраць рэальнае жыццё і звычайных людзей. Замест сенсацыяў з жыцця зорак мы пісалі рэпартажы пра людзей з Ляўкова, разам з імі паломнічалі (дыліжансам запрэжаным у трактар!) у цудоўнае ўрочышча Кудак, запрагалі каня (каб ведаць што рэальна значаць словы песень), ладзілі вечарыны і гутаркі з народнымі апавядальнікамі і пушчанскімі літаратарамі. Зразумела, мы не адкінулі тых забаўляльных рубрык, якія так падабаюцца масаваму чытачу. Таму, з нагоды новага навучальнага года прапануем вам гараскоп на 2010/2011 год. З дзвюх прапаноў мы рашыліся апублікаваць больш аптымістычны прагноз рэдакцыі „Цікаўнасць" і прыздобіць яго малюнкамі з „Пружыны".

Баран (22.03-20.04): Тваё жыццё плыве хутка, быццам рака. Патрабуеш забавы, кампаніі сяброў і перапынку ў вучобе. Час засяродзіцца на тым што найважнейшае для тваёй сям'і. З часам праблемы з фінансамі знікнуць і купіш „джып". Адно, на што варта звярнуць увагу, гэта тваё здароўе, з якім не заўсёды будзе добра. Твая кроўная душа гэта Леў.

Бык (21.04-21.05): У тваім жыцці будзе нямнога змен. У школе ўсё добра. Сябры і сям'я падтрымаюць цябе ў кожнай сітуацыі. На грошы няма чаго наракаць, магчыма, што станеш мільянерам! Твой братні знак — Рак.

Блізняты (22.05-22.06): Заўсёды марыш аб недасяжным, але жыццё з галавой у хмарах не прынясе вынікаў. Пара зысці на зямлю і ўпарадкаваць адносіны з сябрамі і сям'ёй. З грашыма будзе кепска, але шукай сваёй другой паловы, яна будзе спонсарам і магчыма, што будзе гэта Скарпіён.

Леў (24.07-23.08): Сябры і сям'я дацэняць твае геніяльныя ідэі, а грошы зробяць цябе працаголікам. Зоркі кажуць, што ў цябе кепскі час на рандэву. Твая кроўная душа — Дзева.

Дзева (24.08-23.0): Пашчасціцца табе ва ўсім, але ты не спачывай на лаўрах. Тваёй душы прыдасца грунтоўны парадак. Больш часу прызначай на сустрэчы з сябрамі і сям'ёй. З грашыма кепска, але чакай сваёй другой паловы. Яна цябе падтрымае матэрыяльна. Твой добры знак — Скарпіён.

Скарпіён (24.10 — 22.11): Пастарайся мець добрыя ацэнкі ў школе. У цябе будзе чырвоны паясок, ды неабавязкова на пасведчанні. Бацькі будуць дакараць цябе, а сябры зробяць нешта найгоршае ў жыцці. Свой смутак можаш патапіць у кока-коле. Магчыма, суцешаць цябе мілыя Шалі.

Шалі (24.09-23.10): Добрыя дні ўпадуць на цябе як гром з яснага неба. Забудзеш усе школьныя паразы. Надыходзіць найлепшы час, падумай пра сувязі з сябрамі і сям'ёй. Дбай пра здароўе, мікробы не спяць! Твая кроўная душа — Скарпіён.

Рак (23.06-23.07): Тваё жыццё будзе поўнае сюрпрызаў. Чакай вялікай неспадзяванкі. Праблемы з настаўнікамі імгненна знікнуць. Не разлічвай ва ўсім на сяброў, сам выконвай свае абавязкі. Грошы будуць трымацца цябе як калючкі сабачага хваста. Твой знак — Бык.

Казярог (23.12- 20.01): Пачынаецца час шалёных імпрэзак і сустрэч, таму не згубі галавы. Сябры цябе не любяць, аднак калі перастанеш іх ацэньваць, усё памяняецца. Хвароба табе не пагражае, у цябе конскае здароўе. Сяброў знойдзеш пад знакам Рака.

Стралец (23.11- 22.12): Упартасць, агрэсія, няўмеласць даказаць сваю рацыю — твае найгоршыя заганы. Людзі цябе будуць пазбягаць і крытыкаваць. Адзін плюс гэта грошы, якія не адступяць цябе ні на крок. Дзякуючы супрацоўніцтву з фондамі сустрэнеш сімпатычных Блізнят.

Вадалей (20.02- 21.03): Надышоў час перамен. На жаль, зоркі і космас будуць не на тваім баку. Кожную вольную хвіліну ты можаш прызначыць на вучобу, табе спатрэбяцца добрыя ацэнкі. Сябры не пакінуць цябе ў бядзе. Твой знак — Леў.

Рыбы (20.02-21.03): Не будзь залішне ўражлівым на сваім пункце. Не бачыш праблем іншых апрача сваіх, таму не здзіўляйся, што ніхто не падтрымоўвае цябе на духу. Забудзь пра свае грошы, гэта мімалётная справа. Можа нехта з-пад знаку Казярога цябе адменіць.

Песня дыні

(паводле карэйскай пансоры)

У адной вёсцы жылі два браты: Нольба і Гунгбо. Пасля смерці бацькоў, Нольба прагнаў малодшага брата з роднай хаты. Гунгбо з сям'ёй быў вымушаны шукаць прытулку ў іншым месцы і абжывацца з нуля.

Анойчы з гняздзечка ў страсе хацінкі Гунгбо ўпала маладая ластаўка і паламала нагу. Гаспадар пашкадаваў птушку, ён даглядаў яе ў дзень і ў ноч, пакуль яна аздаравела. Вясной, у падзяцы, ластаўка прынесла ў дзюбцы семечка дыні і кінула насенне ў агародчык. З яго выраслі тры прыгожыя дыні. Восенню Гунгбо разам з жонкай разрэзалі дыні і замест зярнят пабачылі ў сярэдзіне вялікую колькасць золата, шоўк, рыс, брыльянт і пяцёх работнікаў да пабудовы новага дому.

Пра здарэнне адразу даведаўся Нольба. Ён таксама злавіў ластаўку, паламаў ёй нагу і пачаў яе лекаваць. На весну птушка прынесла семечка дыні. Нольба ледзь не памёр у чаканні восені. Пасля, калі ў гарачцы ён раскроіў дыню, замест шоўку і брыльянтаў, яго ўхапілі злыя духі. Яны належна ўкаралі нячэснага і прагавітага брата.

ЗОРКА

PS. Пансоры — від народнай оперы, які належыць карэйскаму вакальнаму мастацтву. Яго развінулі сярэднявяковыя музыканты-прафесіяналы.

Вялікі бізнесмен займаецца земляробствам!

Калі мы сустрэліся са спадаром Барысам Казлоўскім, мы не ведалі што атрымаецца такая размова. Ён вярнуў нас у часы, калі жылі ягоныя бацькі і дзяды. Мы даведаліся аб прыладах, якімі людзі карысталіся адносна нядаўна, а сёння мы думаем пра іх як пра помнікі мінуўшчыны. Сучасны свет моцна памяняўся.

— Калісь чалавек усё жыццё трымаўся адной працы, — кажа пан Барыс, — а сёння пабудзе тры месяцы на адным месцы і мяняе работу. Часам вялікі бізнесмен кідае працу, уцякае з горада і пачынае займацца земляробствам. У наш час ужо не так важна, якая ў цябе адукацыя, але якое тваё стаўленне да працы. Каб здабыць добрую прафесію, не хопіць закончыць добрую школу. Трэба яшчэ быць цікавым свету і гатовым на эксперыменты ды прагнуць чагосьці новага ў сваім жыцці.

Спадар Казлоўскі вельмі мудры чалавек. Дзякуючы яму, мы зразумелі, што большасць жыццёвых няўдач — вынік падсвядомасці. Атрымліваецца так, як падумаеш, таму мусім памятаць, каб заўсёды гаварыць сабе што будзе добра!

„Цікаўнасць", **Лукаш Зіневіч**, III клас Гімназіі ў Гарадку,
Уля Беразавец, I клас Гімназіі ў Нарве

Новае лета — новыя сябры

Праўду кажуць: чым больш сяброў — тым цікавей жыццё. Члены Камянецкага раённага грамадскага культурна-адукацыйнага аб'яднання „Спадчына" пазнаёміліся і адразу пасябравалі з членамі грамадскай арганізацыі „Вароты на балоты" (Brama na bagna) гміны Завады Рэспублікі Польша.

А для вырашэння арганізацыйных пытанняў, планавання работы, падпісання дамоваў войт гміны Завады Павел Пагажэльскі запрасіў 28 членаў Камянецкага раённага грамадскага культурна-адукацыйнага аб'яднання (19 дзяцей і 9 дарослых) на 6-8 жніўня на Дні Завад.

Мы пабывалі ў Высока-Мазавецку, Беластоку, Завадах, Бельску-Падляшскім, Стрэнковай-Гары. Усюды нашу дэлегацыю сустракалі цёпла і сардэчна.

8 жніўня ўзорны клуб аматараў фальклору „Катрынка" выступіў з фальклорнай і эстраднай праграмай перад жыхарамі і гасцямі Завад.

Вельмі цікавымі былі на свяце адкрыццё пляцоўкі па правілах дарожнага руху для дзяцей, пасвячэнне юнакоў у члены дабравольнай пажарнай дружыны, віктарына па пажарнай бяспецы. У віктарыне прымалі ўдзел прадстаўнікі нашай дэлегацыі і атрымалі ўзнагароду.

Атракцыёны, гульні, жарты і, канечне, салодкая вата — усё спрыяла добраму настрою. Сумесная дыскатэка яшчэ болей зблізіла беларускіх і польскіх дзяцей.

Запланаваны сумесныя адпачынкі, канцэрты, варштаты, сумесная праца над праектамі. Падпісаны ўмовы аб супрацоўніцтве на тры гады.

Людміла ДУДАР
Старшыня КРГКАА „Спадчына"

Музыка з кайфам

За „Акутэ"!

Раман і Стас — гэта яны неслі на сваіх плячах папулярнасць магілёўскага гурту „Глюкі". У 2008 годзе гурт распаўся, з-за чаго бас-гітарыст Раман Жыгараў шмат часу патраціў на роздумы. Не пайшоў гэты час на змарнаванне. Тры тыдні пошукаў пераўтварыліся ў новую ідэю. Супольна з гітарыстам і вакалістам Стасам Мытнікам вырашылі не спыняцца і пачалі працаваць над новым матэрыялам. Хутка аказалася, што матэрыял і патэнцыял на новае творчае жыццё гатовы. Назвалі яго „Акутэ".

„Акутэ" аказаўся ў Беларусі неспадзяванкай 2009 года. З восені 2008 года пачалі канцэртаваць, а ў палове наступнага года ўдалося ім папасці ў клубныя змаганні на фестывалі „Be2gether". Перамаглі яны ў конкурсе на гарадоцкім „Басовішчы". Напісаная з жалю па мінулым песня „Адзіноцтва" стала прыкладам як рабіць песні на беларускай мове па міжнародных сучасных стандартах. Вучацца ў такіх рэфарматараў як „The Killers" ці „The Strokes". Эфекты відавочныя.

Раман — юрыст, Стас — цепла-энергетык. Імкнуцца займацца толькі музыкай і з музыкі жыць. Не здаюцца, хаця такое жыццё ў Беларусі даступнае толькі адзінкам. Выхаваныя ў расійскамоўных сем'ях пішуць песні на беларускай мове, бо, як кажуць, гэта для іх самае блізкае, натуральнае і не пазбаўляе іхняй творчасці глабальнага кантэксту. Яны — частка музычнага сусвету, а калі так, тады сусвет іх ацэніць належным чынам! Пакуль займаюцца сваім агародам, у якім растуць чарговыя песні. Свой стыль акрэсліваюць як „дыска-дэкаданс". Калі „дыска", значыць гэта, што класны бубнач абавязковы. За бубнамі засеў Павел Емяльянаў, вядомы раней з магілёўскага гурту „Nevma" (зараз кожны з пералічаных гуртоў лічыцца лаўрэатам „Басовішча", зразумела, у розных гадах). Гледзячы на спеласць гучання і жыццёвы план Рамана ды Стаса, „Акутэ" мае перад сабой шмат працы і шанц на поспех.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 35

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 31:

Губы, кола, пакос, сказ, бо, марак, павук, як, касетка. Дух, смак, ты, кава, парус, казак, кок, лоб, як, насоўка.

Узнагароду, кампакт-дыск з беларускай музыкай, выйграў **Рафал Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



Запусты і выстаўка ў Скарышэве

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Людзі з Беласточчыны, а нават турысты з іншых рэгіёнаў ведаюць пра Беларускую рэгіянальную ізбу Міхала Фільяновіча ў Скарышэве, якая ў 2004 годзе была арганізавана ў разбудаваным гаспадарчым будынку, а пасля таксама ў клуні. Сабраны там пад дзве тысячы экспанатаў. Сам Міхал Фільяновіч заяўляе, што не сароміцца сваёй беларускай нацыянальнасці і праваслаўнага веравызнання ды з гонарам расказвае прыезджым пра гісторыю і традыцыі роднага Скарышэва, даўняга прадмесця горада Нарвы, пра якое знайшоў весткі ажно з XVII стагоддзя. 13 жніўня ў Скарышэўскім музеі, бо і так людзі называюць ізбу спадара Міхала, былі наладжаны запусты перад Успенскім постам і выстаўка рукадзелля „Вышыўка і карунка”.

Міхал Фільяновіч — арганізатар музея і выстаўкі

Скарышэва — невялікая вёсачка, дзе адзіным дзейсным гаспадаром з’яўляецца Міхал Фільяновіч, які апрацоўвае два гектары зямлі і займаецца агратурызмам. Калі перад яго панадворкам спыняліся машыны з гасцямі, на вуліцу выходзіў сам гаспадар, асабіста вітаў прыбылых і запрашаў адпачыць на прыродзе. Дзве хаты прыспасобіў ён да агратурыстычнай дзейнасці, а на панадворку выкапаў сажалку і, разам з жонкай Аннай, пасадзіў многа дрэўцаў, кусцікаў і кветак. Удзельнікі мерапрыемства маглі пашпацыраваць па дарожках паміж расліннасцю і хаткамі, а пасля ўсе перайшлі ў клуню, што разам з хлявом знаходзяцца на другім баку вуліцы, і там адбылося адкрыццё экспазіцыі, у час якога прысутны быў між іншым святар Кленіцкага прыхода а. Хрыстафор Высоцкі.

— Мы, беларусы, не ацэньваем належным чынам сваёй вартасці, нашай спадчыны і таму маем праблемы з асіміляцыяй. Мала цікавімся сваім мінулым. Асабліва гэта тычыцца маладых людзей, — гаварыў, адкрываючы выстаўку „Вышыўка і карунка”, Міхал Фільяновіч. — Цешыць мяне, што школьная моладзь прыязджае да мяне на майстар-класы. Падтрымліваючы сваю традыцыю і культуру, хацеў бы я зацікавіць імі маладых людзей.

На выстаўцы паказваецца рукадзелле. Сярод ручных прац вельмі цікавымі былі вышыўкі на даўніх ручніках, якіх мноства красавалася на сценах клуні. Цікавымі былі таксама сурвэткі, выкананыя кручком, якімі ў мінулым упрыгожваліся сталы і шафкі. Побач іх ляжалі карункі, якімі аздабляліся ручнікі і абрусы. Мяне зацікавілі выкананыя кручком і вышываныя па палатне абрусы. Сабраныя затрымліваліся таксама побач прыгожа вышываных макатак. Асобна знаходзіліся працы вышываныя крыжыкам аўтарства бельскай настаўніцы Анны Сідарук, якія яна перадала музею. Былі на іх раслінныя і ландшафтныя матывы. На экспазіцыі прэзентаваліся таксама ўпрыгожанні з саломы, якімі ў мінулым прыбіраліся хаты.

— Я памятаю, як у нашай хаце былі расстаўлены кросны і маці ткала, — гаварыў мужчына сярэднягя ўзросту, спыніўшыся ў клуні каля кроснаў і ільноапрацоўчых прылад.

— Спачатку я хацеў наладзіць у клуні майстар-класы па апрацоўцы ільну і канапель, але калі выступаў за фінансавай дапамогай, мне сказалі, што прыватнай асобе нічога не належыцца. А з кім мне тут засноўваць аб’яднанне? Засталіся ў клуні прылады працы, якія я збіраў у сувязі з гэтай задумай і таму сёння папаўняюць яны выстаўку, — тлумачыў спадар Фільяновіч.

— Вышываныя і карунковыя работы ў нашую Беларускую рэгіянальную ізбу аддавалі нашы бабулі і цёткі. Не зрабіў я тут бізнесу, а калі б хацеў запрэзентаваць больш экспанатаў, патрэбныя былі б адпаведныя ўмовы, дадатковыя памяшканні і большыя сродкі. Гэтая выстаўка была наладжана дзякуючы фінансавай падтрымцы прыватных спонсараў і дапамозе мясцовых. Рашыўся я наладзіць таксама запусты, каб нашыя людзі адпачылі і пагулялі, — тлумачыў спадар Міхал, які запрасіў гасцей за стол, на якім было многа вырабаў ягонай жонкі Анны.

Музычная частка была запланаваная пасля абеду. На выступы нашых калектываў прыбылі мясцовая моладзь і старэйшыя асобы. Калі гурт „Be Happy” пачаў расстаўляць у клуні на таку музычныя інструменты, успомніліся мне словы Міколы Бушко, арганізатара „Ператоча, які гаварыў, што ў мінулым на таку ладзіліся танцы і спевы. У Скарышэве адбылося гэта на практыцы, бо калі музыканты і спевакі знаходзіліся на таку, публіка была на ператочы, якое распасціралася на невялікі панадворак.

Суарганізатарам мерапрыемства быў Нарваўскі асяродак культуры, які падаслаў у Скарышэва музычныя калектывы. Перад сабранымі выступілі калектывы „Нарва”, „Be Happy” з Нарвы і ласінскі калектыў „Рамонак”. Пацікавіўся я адкуль у калектыву „Be Happy” такая іншамоўная назва.

— Мы не глядзелі ні на моду, ні на іншыя калектывы, але калі пачыналі іграць, трэба было вельмі хутка прыдумаць назву, каб змясціць яе на афішы і мы гэтае „Be Happy” знайшлі ў інтэрнэце і так асталося, — заявіў адзін з членаў калектыву.

У час мерапрыемства паявілася пытанне наконт пачаткаў дзейнасці Беларускай рэгіянальнай ізбы.

— У васьмідзесятых гадах я працаваў за мяжой і пабачыў як людзі на Захадзе шануюць свае традыцыі і спадчыну. Рашыўся я рабіць тое ж у сябе, — патлумачыў спадар Фільяновіч.

Спачатку разбудаваў ён гаспадарчы будынак і там змясціў экспанаты з даведкай на беларускай літаратурнай мове. Пачаўшы агратурыстычную дзейнасць, стаў прыстасоўваць таксама клуню для экспазіцыйных мэт.

— Гэтай каменнай хрысцільні напэўна за 300 гадоў, а вялікую ікону Трох Святцелей перадалі мне апошнім часам з прыхода ў Тыневічах, — сказаў спадар Фільяновіч, паказваючы таксама экспанаты ў асноўным музейным будынку. Побач даўніх хатніх прылад і вырабаў з палатна экспануюцца старыя земляробчыя і рамесніцкія прылады, а таксама друкаваныя помнікі мінулага. Спадар Фільяновіч сабраў многа арыгінальных экспанатаў, напрыклад, калекцыю пячатак праваслаўных прыходаў Беласточчыны і нарваўскіх суда, ратушы і думы з XIX стагоддзя. Там, дзе распаложаны рэлігійныя экспанаты, побач рызаў знаходзяцца старыя крыжы невялікіх размераў і старая ікона з Тыневіч. У групе музычных інструментаў знаходзяцца баяны міжваеннага перыяду. Спадару Міхалу ўдалося сабраць даўнія грошы, сярод якіх маецца невялікая цікавая калекцыя манет. У агракватэрах спадарства Фільяновічаў адпачываюць не толькі айчынныя, але і замежныя госці. Якраз перад адкрыццём выстаўкі беларускую ізбу наведалі журналісты французскага прыватнага тэлебачання, якія мелі нагоду пабываць на запустах.

Родам з Беласточчыны

ЛЕГЕНДАРНЫ ДОКТАР УСЕВАЛАД ШЫРАН

Сяргей ЧЫГРЫН

Польскі штогоднік „Rocznik Parafii Świętego Krzyża" за 1991-1993 гг. апублікаваў вынікі пяцігадовых пошукаў ахвяр Беразвечча (беларускай Катыні) на Віцебшчыне. Штогоднік пісаў, што 13 красавіка 1991 г. адбылася ўрачыстая імша ў Беразвеччы па бязвінна закатаваных суайчыннніках. Такое ж ушанаванне ахвяр НКУС адбылося і ў вёсцы Мікалаёва каля Улы Бешанковіцкага раёна. У той 1939 г., калі Заходняя Беларусь адышла да Усходняй, было арганізавана каля 200 турмаў, якія сталі месцам дзікіх злачынстваў над людзьмі. Там закатавалі насмерць каля тысячы чалавек. Сярод іх быў і наш зямляк з Беласточчыны доктар Усевалад Шыран.

Усевалад Шыран нарадзіўся 11 сакавіка 1906 года ў вёсцы Лась Мазавецкага ваяводства (па іншай інфармацыі ён нарадзіўся ў вёсцы Лапы на Беласточчыне). Спачатку вучыўся ў Ломжынскай гімназіі, а потым працягваў вучобу ў Навагрудскай гімназіі імя Адама Міцкевіча, якую скончыў 9 чэрвеня 1925 г.

Пасля заканчэння Навагрудскай гімназіі Усевалад Шыран паступіў у Віленскі ўніверсітэт імя Стэфана Баторыя на медыцынскі факультэт. Ужо на трэцім курсе ён пачаў працаваць на кафедры ў якасці малодшага асістэнта апісальнай анатоміі, самастойна праводзіў навуковыя даследаванні. Адначасова Усевалад пачаў цікавіцца і палітыкай. Яго хвалявалі пытанні нацыянальнай і сацыяльнай справядлівасці, адраджэнне нацыянальнай беларускай самасвядомасці.

13 сакавіка 1932 г. юнак з Беласточчыны выдае на беларускай мове ў Вільні першы нумар палітычнага і літаратурнага „Часопіса для ўсіх" накладам 2 тысячы асобнікаў. Але польская паліцыя хутка тыраж часопіса ліквідавала, а далейшае яго выданне забараніла. Сам рэдактар быў адпраўлены ў Лукішкі. У гэтым выданні непасрэдны ўдзел прымаў і Максім Танк, якога таксама хутка арыштавала дэфензіва і пасадзіла ў Лукішкі. Нядаўна прафесар Андрэй Майсяёнак з Гродна перадаў мне копію пісьма Максіма Танка да яго. Пісьмо Максімам Танкам да Андрэя Майсяёнка было напісана 27 лютага 1988 г. Спадар Майсяёнак цікавіўся тады Усеваладам Шыранам і пытаўся ў Танка пра яго. Народны паэт Беларусі пісаў: „На вялікі жаль, вельмі мала захавалася ў маёй памяці звестак пра Усевалада Шырана, бо з таго часу, калі я з ім сустракаўся, мінула больш 50 год. Пазнаёміў мяне з ім адзін з кіраўнікоў камуністычнага падполля вясной 1932 г. Шыран тады збіраўся выдаваць прагрэсіўны журнал „Часопіс для ўсіх". У гэтым часопісе, які адразу быў канфіскаваны польскай цэнзурай, былі змешчаны мае апавяданні і вершы. З таго часу сувязі з маім рэдактарам на нейкі час перарваліся. І толькі вясной 1933 г., калі я працаваў у падполлі, я зноў сустрэўся з Усеваладам Шыранам у Лужках на Дзісненшчыне...".

Сапраўды, калі наш зямляк трапіў у турму, ён ужо меў дыплом урача Віленскага ўніверсітэта. Але прафесія — прафесіяй, а палітыка — палітыкай. Менавіта палітыка перашкодзіла Усеваладу Шырану застацца працаваць ва ўніверсітэце, займацца навуковай дзейнасцю. 1 траўня 1932 г. усе планы маладога ўрача рухнулі. Ратаваць аднакурсніка і сябра, а пазней мужа, пачала яго сяброўка па жыцці Браніслава Смольская. Дзякуючы ёй, Усевалада Шырана вызвалілі пад заклад. Дапамаглі гэта зрабіць спадарыні Смольскай прафесары Сяргей Леанард Шылінг-Сенгалевіч і Міхал Райхер з Вільні, якія пазычылі ёй 300 злотых. А 30 верасня 1933 г. Віленскім следчым аддзелам справа была закрыта з-за недастатковых доказаў.

Пасля турмы Усевалад Шыран разам з Браніславай Смольскай вырашылі пакінуць Вільню і паехаць дзесь у глыбінку. Месцам працы яны выбралі вёску Лужкі на Дзісненшчыне. Там іх мясцовая ўлада сустрэла не вельмі добра. Але Браніслава Смольская ўладкавалася працаваць у бальнічную касу, а Усевалад Шыран захапіўся прыватнай медыцынскай практыкай. І ў яго атрымалася даволі паспяхова. Слава пра доктара Шырана хутка разышлася па ўсім Дзісненскім і суседніх паветах. З пісьма Максіма Танка да Андрэя Майсяёнка: „Відаць з Усевалада Шырана быў харошы доктар, бо слава аб ім ішла далёка па ўсіх суседніх гмінах, бо ён, як тады казалі, лячыў ад усіх хвароб...".

І гэта было так. Доктар мог абыходзіцца практычна без спецыялістаў і выконваў самыя складаныя хірургічныя, акушэрскія, афтальмалагічныя і оталарынгалагічныя аперацыі па тым часе. Як расказаў аўтару гэтых радкоў гродзенскі прафесар-медык Андрэй Майсяёнак, які меў сустрэчу пры жыцці з жонкай Усевалада Шырана, Браніславай Людвікаўнай Смольскай, і якая яму распавядала, што дзіўны дар Усевалада Шырана, як гісторыка, літаратара, публіцыста і медыка, таксама адыграў важную ролю сярод беларускага, яўрэйскага і польскага насельніцтва ў іх лячэнні. Шыран яшчэ быў выдатным пчалаводам і селекцыянерам. Ён вырошчваў незвычайныя гатункі кветак і кавуноў. На свае ўласныя грошы ён купіў і меў у Лужках медыцынскае абсталяванне, даволі дарагое па тым часе.

Але мясцовыя польскія дактары ім былі незадаволеныя, бо яны страчвалі пацыіху сваю кліентуру. Ды і паліцыя за Шыранам пільна сачыла. Таму ў 1937 г. сям'я Шырана пакінула Дзісненшчыну і пераехала ў Высока-Літоўск. З архіўных дакументаў, якія захоўваюцца ў Брэсцкім абласным архіве, можна даведацца, што Усевалад Шыран польскімі ўладамі падазраваўся ў дзейнасці, накіраванай супраць тагачаснага ўрада Польшчы. Яго не прызначалі на афіцыйныя дзяржаўныя пасады, таму і ў Высока-Літоўску наш зямляк займаўся прыватнай медыцынскай практыкай. Але і не забываў Лужкоў, куды зрэдчас наведваўся, лячыў людзей, даваў кансультацыі. Там у Лужках ён сустрэў і 17 верасня 1939 г. З прыходам саветаў, ён з сям'ёй зноў вярнуўся на Дзісненшчыну. У маёнтку Гарадзец Усевалад Шыран з жонкай Браніславай разгарнуў узорны стацыянар на 100 ложкаў, куды ён прывёз усё прыватнае медыцынскае абсталяванне. У той час не хапала медыцынскіх кадраў, таму доктар Шыран арганізаваў курсы медыцынскіх сясцёр. Той жа Андрэй Майсяёнак пра доктара Шырана ў шаркаўшчынскай раённай газеце „Кліч Радзімы" ў 1988 г. пісаў: „Вельмі хутка ўзрасла актыўнасць Лужкоўскай бальніцы. Медыцынская сітуацыя стала хутка паляпшацца. Таленавіты хірург змог арганізаваць правядзенне ў мясцовых умовах складаных хірургічных аперацый, а таксама дэталёвы догляд у пасляаперацыйным перыядзе. Цікава, што менавіта ў гэты час ён шырока карыстаўся „стацыянарам на даму", аб якім так многа размоў сёння. Ён шчодра дзяліўся сваімі ведамі з прадстаўнікамі савецкай аховы здароўя, прапаноўваў арыгінальныя метады лячэння розных захворванняў, аб чым пісаў у рэдакцыю ўсесаюзнай газеты „Медицинский работник", актыўна ўдзельнічаў ва ўсіх мерапрыемствах савецкай улады. Не застаўся забытым і выведзены сорт кавуноў — ён быў прапанаваны Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. Савецкія даследчыкі з разуменнем і ўвагай аднесліся да яго".

Яшчэ ў сярэдзіне 1930-х гг. Усевалад Шыран друкаваў у заходнебеларускіх часопісах свае вершы, якія змяшчаліся побач з вершамі Міхася Машары. Ды справа была далёка не ў літаратурных заслугах, а ў незалежных паводзінах нашага доктара пры паляках і папулярнасць яго як лекара. Як чалавек знаны на Дзісненшчыне і які родам быў з Беласточчыны, яго абралі ў 1939 г. на Народны сход у Беластоку, які фармальна вырашаў лёс Беларусі. Дэпутатам Народнага сходу быў абраны і Міхась Машара, які, дзякуючы тактычнаму ходу, першы з заходнебеларускіх паэтаў напісаў хвалебны верш пра Сталіна. Вершаў Сталіну Усевалад Шыран не пісаў і не думаў пісаць. Але Машару пашанцавала, а вось Шырану — не. У чэрвені 1941 г. яго арыштавалі органы НКУС. Савецкай уладзе, значна больш чым польскай, мог не заімпанаваць яго нонканфармізм і нацыяналізм. Можа былі і якія-небудзь іншыя прычыны, адзін Бог ведае. Але пасля арышту ў спецыцы супрацоўнікі НКУС легендарнага доктара Усевалада Шырана расстралялі.

Працуючы над пошукамі звестак пра нашага земляка, напісаў я ліст да даследчыка заходнебеларускай літаратуры і культуры Арсеня Ліса і спытаўся ў яго, што ён ведае пра Усевалада Шырана. Арсень Сяргеевіч адказаў: „Рад, што вы, руплівы шукальнік і вяртальнік нашай спадчыны, хочаце вырваць з цемры забыцця імя Усевалада Шырана. Калісь у маладосці сустракаў яго вершы ў часопісе „Шлях моладзі" за другую палову 1930-х гг. У „Калоссі", праўда, хоць поўны камплект не трапляў, здаецца, публікацый яго з чатыры было. Вершы не зрабілі ўражання. Але, пачуўшы ад светлай памяці Яўгена Іванавіча (маецца на ўвазе Максіма Танка — С. Ч.) пра яго гвалтоўную смерць у чэрвені 1941 г., быў узрушаны. Даведаўся, што Усевалад Шыран быў папулярнай на Дзісненшчыне, як доктар, лекар і як чалавек незалежных поглядаў, асобай. Фота, на жаль, яго падабізны нідзе не давялося бачыць. Думаю, што можна знайсці ў Вільні. Напэўна, ён канчаў медыцынскі факультэт пры ўніверсітэце і там захавалася яго справа асабістая, куды звычайна далучалі фотакартку. Відаць, ёсць яна і ў справе, якая захоўваецца ў Мінску ў архіве КДБ, але цяпер той архіў недаступны. Вось і ўсё, што магу вам сказаць пра Усевалада Шырана".

НА ЛАВАЧЦЫ Ў ЦЕЛУШКАХ

Вечарэла. На дварэ мінула спякота, зрабілася прахалодна. Хто-ніхто выйшаў на вуліцу.

— Якая выгада, — кінула мне праз плот, высунуўшы галаву з-за вугла хаты Маруся, — што ёсць у хаце лазенька, што і раз можна спаласнуцца халоднай вадою.

— Не ўсім так выгадна, не ўсе яшчэ маюць лазенькі ў вёсцы, падхапіла тэму я. — Адзінокія і старэйшыя такой выгоды не маюць.

Неўзабаве на Надзінай лавачцы сабраліся тры жанчыны і двух мужчын. Сёння ж нядзеля, людзі адпачылі, паспалі ды ў прахалодны адвячорак і на лавачцы пабалакаюць удоваль з прыемнасцю. Большасць з іх гэта людзі ўжо пажылыя, адзінокія. Часам можна пажартаваць, пасмяяцца, а часам паўспамінаць мінулае, маладосць, а то і даведацца, што новае ў вёсцы. І я, з адзінай тут маладой суседкай Аляй, якая прыязджае адпачыць з Беластока, з прыемнасцю ходзім на лавачку. На лавачцы чысценька, а то і плахаткай яна пасцелена. Учора з самай раніцы, калі я ехала веласіпедам у Канюкі, Надзя з грабелькамі прыбірала вакол лаўкі.

— Я сёння з самай раніцы ездзіў у Паўлы, у склеп, па лёды. Думаў: хто прыйдзе, пагутарым. А прыйшлося сядзець аднаму. Куды не кінешся, усюды мала людзей. Усюды сумна, пажартаваць няма з кім, — сусед Іван быў незадаволены.

— А галасаваць вы ездзілі? — звярнулася я да пажылой суседкі Надзі, уласніцы лавачкі.

— Куды там, толькі пару мужчын паехала тады; чаго я, старая баба, паеду!

— У бабаў такі ж важны голас, чаму б не ехаць! — азвалася адна з суседак.

— Галасавалі толькі чатыры ці пяць чалавек з нашай вёскі, і я галасаваў на Грышку з СЛД, — смеючыся, працягваў размову Іван.

— Ну што ты, больш чалавек паехала на выбары, хоць праўда, станоўча замала, як на цэлую вёску, — паправіла Івана другая з жанчын.

— А што нам дадуць выбары, рэнты нам ніхто не дадасць! Нам, вяскоўцам, усё роўна хто будзе прэзідэнтам, — падхапіў тэму другі сусед.

— А я сёння і ў храм не паехаў, таксама гарачыня, цяжкавата, — змяніў тэму сусед Мікалай, які ўжо другі год змагаецца з жыццём у адзіночку. Жонка адышла, сын з Беластока памагае гаспадарыць. Толькі жвавая суседка Маруся спякоты не баіцца, штонядзелю мчыцца веласіпедам у пухлаўскі храм.

— Я часта, бывае, што і па тры разы еду ў Паўлы або ў Рыбалы ці Заблудаў, — ізноў азваўся Іван.

— О, гэта добранькі суседзік, — перабіла яму Надзя. — Ён усюды пры патрэбе чалавека завязе, і рахункі заплаціць, ой, добранькі наш Іван. Пры ім і пасмяяцца можна.

— Жартаваць то ён умее, як ніхто іншы!

— Нібы гаспадароў у вёсцы толькі трох, кароў мала, а вуліцы часта заляпаныя, а то яшчэ і перад самай лавачкай прыбраць па сваіх каровах, хітруны, не хочуць, — пачаў хтосьці.

— О, у нас перад самай брамай сёння я была вымушана прыбраць, — Маруся была вельмі незадаволеная.

— І перад маёй брамай не раз напаскуджана, ды адкуль ведаць, чые каровы? — здзівілася я.

— А я ведаю чые наляпалі ў тры гадзіны раніцы, я ўжо не спала і бачыла хто гнаў. Сустрэўшы, вылаяла яго, а ён на тое: „О-о-о, адкуль вы ведаеце, што гэта мае каровы?!", зарагатаў адно толькі, а ты, баба, махай „лідроўкай"! — узлавалася Маруся.

— О, глядзіце, едзе машына, трубіць так гучна, напэўна „рускія" з таварамі! — уцешылася адна з суседак.

— Ой, як добра, зараз будзем таргаваць!

„Рускія" пад'ехалі да нашай лавачкі, спынілі аўто і адкрылі сваю крамку: хусткі, гумавыя чобаты, бялізна, капелюшы і ўсякая іншая ўсячына. Усім вочы разбегліся, спынілася гамонка аб нічым важным і штодзённа аб тым самым. Усе заняліся аглядам тавараў.

— О, я бяру мужчынскія майткі, дзве пары, — сказаў Іван, — выбіраюся ў шпіталь. Можа маеце яшчэ і піжаму?

— Не, піжам у нас няма.

— І я куплю мужчынскія майткі, няхай ляжаць новенькія ў шафе на ўсякі выпадак! — беручы тавар у рукі прымеркавалася Маруся.

— Я таксама мужу купіла, праўда, не на ўсякі выпадак, а таму, што на змену забылася ўзяць з хаты.

Тут мы з Аляй пачалі прымерваць капелюшы: ружовы ці галубовы?

— Бяры, суседачка, ружовы, падыходзіць вам да твару! — параіла мне Маруся.

Тут падбеглі і нашы малечы — Алін сын Марк і мая ўнучка Наталька:

— Нас камары ноччу кусаюць, купіце штосьці на гэтыя паскуды!..

Так мы з Аляй, замест капелюшоў, купілі гель ад камароў (памагае!). Іншыя жанчыны купілі хусткі. Машына ад'ехала, а з-за паварота паказаўся падхмелены, як штодзень, Ваня, кавалер пад пяцьдзесят, сімпатычны, мілы чалавек, калі б не...

— Хадзі сюды, сядай, — запрасілі Ваню жанчыны.

Ваня сеў каля Алі і пачаў па-свойму балбатаць:

— Я штодзень агуркі выбіраю...

— Ты так іх старанна выбіраеш, што ўсе насеннікамі параслі, як ты сам! — пырскнула Аля. Усе на лавачцы зарагаталі, толькі адзін Ваня не злавіў намёку і далей працягваў сваю балбатню. Аля далей жартавала з Вані, пакуль той не ўстаў з лаўкі і кудысьці забраўся.

— Усё ж добры з яго чалавек! — азвалася я. — Учора бачыла, як купляў у суседкі малако сваім катам. А ці можа быць кепскім чалавекам той, хто клапоціцца аб звярах? На вёсцы людзі не шануюць ні сабак, ні катоў, тыя часта ходзяць галоднымі...

Усе памаўчалі.

— Мне трэба дамоў, зварыць манну, павячэраць і спаць, заўтрака зноў поўныя рукі работы: карова, свінні, — Мікалай устаў з лаўкі.

Усе памалу пачалі падымацца і разыходзіцца па хатах. Заўтра будзе новы дзень, будзе падобны вечар...

Ніна БРУЧКО



У той час, калі беларускае школьніцтва ў Беларусі змяншаецца — згодна даных, што прыводзіць радыё „Свабода", у беларускіх школах вучыцца менш за 20% усіх вучняў у краіне — у Літве ўжо многа гадоў навучае па-беларуску Віленская сярэдняя школа імя Францыска Скарыны. Відаць, тамтэйшым беларусам у плане навучання на роднай мове пашчасціла значна больш, чым тым, што жывуць у беларускай дзяржаве.

«Наша школа дае магчымасць вывучаць беларускую мову, бліжэй пазнаёміцца з багатай культурай беларускага народу, — так прэзентуецца школа на яе сайце, які месціцца па адрасе http://www.skorina.info. — Тут вы вывучыце шмат моў, даведаецеся пра гісторыю Літвы і Беларусі. Самыя лепшыя настаўнікі пазнаёмяць вас з рознымі прадметамі на беларускай і дзяржаўнай мовах.

Аўстрыйскія студэнты так прарэкламавалі нашу школу: „Прыходзьце ў гэту школу, нават калі вы і не беларус. У ёй вы навучыцеся як жыць і ўжывацца з беларусамі". Школа для нас больш чым проста ўстанова, дзе вучаць. Гэта месца, дзе маладыя людзі пазнаюць навакольны свет і знаходзяць сябе».

Што ж тычыцца сайта школы, які з'яўляецца яе тварам у інтэрнэце, то выглядае ён даволі прывабна, і адразу бачна, што ягоныя распрацоўшчыкі парупіліся, стваравочы гэтае вэб-прадстаўніцтва. Фотаздымкі, якія рухаюцца справа налева, адлюстроўваюць сувязь сучаснай беларускай школы ў Вільні з Беларускай гімназіяй, якая была адкрыта ў гэтым горадзе ў лютым 1919 года.

Ніжэй ідзе дэвіз, пад якім праходзіць цэлы навучальна-выхаваўчы працэс: „Жыццё канечна, радзіма вечна". Тут таксама можна правесці паралель з Беларуссю, дзе падобнага лозунгу аўтару гэтага артыкула сустракаць не давялося.

Выйсці на асноўныя рубрыкі сайта месцяцца з левага боку на чырвоным фоне. Практычна кожная з іх змяшчае падрубрыкі. Так, у „Актуаліях" мы можам даведацца пра навіны з жыцця школы, мерапрыемствы.

Рубрыка „Афіцыйнае" змяшчае разнастайныя дакументы, якія датычаць праграмы дзейнасці школы, яе місіі, прынцыпаў функцыянавання школьнай і вучнёўскай рад, бацькоўскага камітэта. Таксама тут прапаноўваецца аказаць фінансавую дапамогу школе, пералічыўшы частку ад сваіх падаткаў.

Паколькі кожная школа зацікаўленая ў новых вучнях, для іх таксама маецца асобная старонка. На ёй распавядаецца пра тыя вартасці навучання, якія чакаюць новых шкаляроў. Сярод іх — асобасны падыход да кожнага вучня; актыўная пазакласная дзейнасць; экалагічны ўхіл школы; магчымасць паступаць у ВНУ Літвы, Беларусі і Еўрасаюза.

Але ацаніць жыццё школы немагчыма без расповедаў пра яе ад вучняў ці настаўнікаў. Такі форум месціцца на старонцы „Пра нас гавораць", які стаіць унізе цэлага выяўлення. „Ад нашых вучняў я пераняла шмат жыццёвай мудрасці", — кажа дырэктарка школы Галіна Сівалава. „У нашай школе ўсе настаўнікі вельмі добрыя... Толькі я не вельмі люблю гісторыю", — нібыта адказвае ёй вучань Міхал.

„Кожны дзень я важу вучняў нашай школкі. З імі вельмі весела. Дзень заўсёды пачынаецца вельмі добра", — падагульняе вынік сваіх штодзённых дачыненняў са школай вадзіцель Ігар.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Рэнесанс Герасімені

Чэмпіянат Еўропы па водных відах спорту, які прайшоў у сталіцы Венгрыі Будапешце, падарыў беларускім заўзятарам прамень надзеі ў цёмным царстве скептыцызму. У айчынным мужчынскім плаванні даўно ўжо катастрафічная сітуацыя. Вось і на кантынентальным першынстве Беларусь была прадстаўлена толькі двума атлетамі. Павал Санковіч, рэкардсмен краіны на дыстанцыях 100 метраў на спіне і 100 метраў батэрфляем, не здолеў паказаць свае лепшыя вынікі і не прабіўся нават у паўфінальныя заплывы. З жанчын найбольшага поспеху дамаглася Аляксандра Герасіменя, якая заявала ажно дзве ўзнагароды. На гэты раз мы назіралі рэнесанс беларускай „залатой рыбкі". Адна з прычынаў поспеху — кардынальныя змены ў правілах сусветнага плавання. А менавіта адмова ад поліурэтанавых купальнікаў. Забарона „гумовых" касцюмаў і пераход на тэкстыльныя камбінезоны сама найлепшым чынам сказаліся на гатовасці Герасімені. Спярша ў фінальным заплыве яна абнавіла асабісты рэкорд на дыстанцыі 100 метраў вольным стылем, гэтага хапіла для сярэбранай узнагароды. А вось на адрэзку ўдвая карацейшым на спіне Аляксандра прадэманстравала свае моцныя якасці і заслужана ўзяла золата (гэта яе найвышэйшы вынік на чэмпіянатах Еўропы) з лепшым часам сезону. Шкада, што не выступала галоўная фаварытка сезону ў гэтым відзе Анастасія Зуева з Расіі. Напэўна б Герасіменя абыграла і яе. Няблага выступіла і беларуска Аляксандра Кавалёва, якая другі раз у кар'еры прабілася ў паўфінал у гэтым відзе і паказала сваё лепшае дасягненне па часе — выніковае 14-е месца. Крыху абнадзеілі Юлія Хітрая (50 м вольным стылем) і Яна Парахоўская (50 і 100 м вольным стылем), якія абнавілі ўласныя рэкорды. Не змагла выйсці на пік формы дасведчаная Святлана Хахлова, яе лепшы вынік — 13-е месца на адрэзку 50 м батэрфляем. У цэлым жа — паспяваць за сучаснымі хуткасцямі нашым плыўчыхам вельмі цяжка.

Два медалі Герасімені прынеслі Беларусі агульнае 10-е месца. Усяго прызёрамі станавіліся прадстаўнікі 19 краін. Найбольшы ўраджай сабралі Францыя — 21 п'едэстальнае месца, Вялікабрытанія — 18, Венгрыя — 13.

У скачках у ваду наадварот, апошняе дзесяцігоддзе ўсе заваёвы беларусаў былі на рахунку мужчын. Прыкладам на мінулым першынстве Вадзім Каптур з Аляксандрам Варламавым сталі сярэбранымі прызёрамі ў сінхронных скачках з 10-метровай вышкі. Накал змагання ў гэтым найбольш прэстыжным відзе быў высокі і на гэты раз. Каптур цяпер выступае ў пары з Цімохам Гардзейчыкам. Не меўшы ў арсенале вельмі складанай праграмы, наш дуэт амаль бездакорна выканаў свае напрацоўкі і „даскакаўся" да бронзавай прыступкі п'едэсталу. Заканамернасць гэтага выніку Каптур пацвердзіў і ў індывідуальным спаборы, паказаўшы таксама трэці вынік. Гардзейчык тут спыніўся на 7-й пазіцыі. На мужчынскім трохметровым трампліне наш Яўген Каралёў заняў 20-е месца. Сярод жанчын у аналагічнай дысцыпліне ад Беларусі ўдзельнічала Ксеня Кандрашэнкава, якая стала 14-й.

У агульным заліку Беларусь заняла 6-е месца. Усяго ж узнагароды павезлі дамоў скакуны з 9 дзяржаў. Першыя тры месцы па вартасці медалёў занялі Нямеччына, Украіна і Італія, па колькасці першынства Расія.

Зноў выдатна выступілі на чэмпіянаце свету ў Познані беларускія весляры на байдарках і каноэ. Пра іх поспехі ў наступным нумары пры падвядзенні спартовых вынікаў жніўня.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Летапіс чаромхаўскай асветы

Уладзімір СІДАРУК

(3)

1956 год для школы быў трагічны. Не хапала паліва. У студзені па прычыне моцных маразоў ва ўсім ваяводстве спынілі на дзесяць дні ўрокі.

Станіслава Барыцкая (Ратыняк) арганізавала біялагічны кабінет, а Леантына Бартосяк (Красоўская) — геаграфічны. Гэты апошні забяспечылі школьнымі дапаможнікамі. Настаўніца Людміла Лось вучыла пластыкі (ручныя работы і аздабленне школы). Купілі сталярную майстэрню і некаторыя прылады. У гэтым годзе былі знесены прамацыйныя экзамены. Застаўся канчатковы — заканчэння школы.

Вучні надалей карысталіся дадатковым харчаваннем. Вялікую зручнасць прыносіла школьная кухня. Дзеці атрымлівалі другое снеданне. Павысіўся ўзровень навучання. Пацвердзіла гэта школьная інспекцыя. У час летніх канікул у школе быў арганізаваны дзіцячы лагер для дзяцей будаўнікоў з Беластока. Узамен беластоцкія будаўнікі збудавалі калодзеж. Паўплывала гэта на лепшае забеспячэнне школы ў пітную ваду.

У 1956/1957 навучальным годзе памяняліся настаўніцкія кадры. Кіраўніком стаў Пётр Бура. У педагагічны ліцэй адышла Людміла Лось. Школа карысталася чатырма кабінетамі: біялагічным, геаграфічным, рукадзельным і фізічным. Кастрычніцкая палітычная адліга паўплывала на ўвядзене ўрокаў рэлігіі. Навучаннем займаліся каталіцкі і праваслаўны святары. Быў знесены экзамен у сёмым класе. Паколькі перамяніліся палітычныя абставіны ў краіне, дык змянілася праграма навучання. Упершыню арганізавалі гурток зацікаўленняў. Перад урокамі (7.45) была ўведзена ранняя лінейка. Узнікла ідэя распаўсюджвання чытальніцтва. Школьнікі выконвалі насценныя газеткі. На ўроках настаўнікі абмяркоўвалі значэнне ўзносаў падаходнага падатку, прычым дзеці мелі ўплываць на бацькоў, каб гэтыя рэгулярна плацілі належнасць. На нізкім узроўні была асабістая гігіена. Пачалі звяртаць увагу на эканоміку вады і электратоку. У красавіку выяўлена 57 захворванняў на паралітычны поліемеліт (хвароба Гейне-Медына). На два тыдні спынілі ўрокі. У навучальным годзе 1956/1957 вучылася 275 вучняў, прытым 190 атрымала перавод у наступны клас, 58 засталося паўтараць навуку на другі год, трое не класіфікавалі, а 22 атрымалі папраўкі.

Чаромхаўскія вучні з настаўніцай Марыяй Шпаковіч (пачатак 1950-х гг.). Злева направа: Васіль Баранаў, Дзмітры Назарук, Віктар Гірын, Галіна Чэкуць, Марыя Шпаковіч, Сцяпан Зінчук, Анатоль Жук, Лявон Кульваноўскі (астатніх аўтару допісу не ўдалося распазнаць)

У навучальным годзе 1957/1958 вярнуўся з арміі Людвік Бартосяк. Адышоў Пётр Бура. Абавязкі загадчыка зноў пераняў Бартосяк. Ліквідавалі штат праваднікa гарцэраў. Арганізацыя стала больш незалежнай ад школы. Апеку над гарцэрамі ўзяў Анатоль Бахарэвіч — работнік насычальні, даваенны гарцэр. Арганізавалі СКО (школьная зберагальная каса). Апекуном назначылі Яніну Скок. Добраўпарадкавалі школьную бібліятэку. Зрабілі падпіску на часопісы ў школьную святліцу і для настаўнікаў. Бібліятэку канчаткова скончылі парадкаваць 1 верасня 1958 года. Апекуном назначылі Леантыну Бартосяк. З мэтай павышэння чытальніцтва аб'яўлены быў конкурс у V-VII класах.

У школе вучылася 270 вучняў; 190 атрымала прамоцыю, 40 вучняў засталося паўтараць клас, 25 атрымала папраўкі, а 5 не класіфікавалі. Дваццаць выдатнікаў атрымалі кніжныя ўзнагароды. Гадовая прысутнасць на ўроках склала 90%.

У 1958/1959 годзе школа карысталася дзесяццю настаўніцкімі штатамі. Стэфанія Сахацкая і Марыя Шостак працавалі ў паменшаным памеры часу, паколькі апекаваліся школьнымі арганізацыямі (Фонд будовы школ і асяродкаў культуры, Школьнае кола адбудовы Варшавы), затым перайшлі на пенсію. На працу паступае Мікалай Гарадкевіч, выпускнік педагагічнага ліцэя. Навучаў ён спевам, ручным работам і фізкультуры. М. Бірыцкая (некваліфікаваная) навучала рускай і беларускай мовам, якія ўпершыню былі ўведзены ў другі клас і лічыліся дадатковымі прадметамі. Навучанне праходзіла паралельна ў трэцім ды пятым класах. Паменшылася колькасць дзетак у малодшых класах. У сёмым класе было 22 вучні.

У 1958 годзе пры школе арганізавалі дзіцячы садок. Адна выхавацелька займалася 30 малечамі. 23 верасня адбылося нечарговае пасяджэнне педагагічнай рады ў справе аднаўлення свецкага характару школы. У лютым наступнага года было прынята рашэнне вясці школьную хроніку. Гэтую задачу даручылі Марыі Шостак.

З таго часу скрупулёзна вядуцца запіскі на старонках хронікі. Варта адзначыць, што хоць узровень навучання ў сёмым класе выклікаў засцярогі, паўтараць клас засталося толькі двое дзетак. У класах I-VII прамоцыі не атрымала 49 вучняў, 10 атрымала папраўкі, а трое не было класіфікаванымі. Выпускнікі чаромхаўскай школы, якія ў 1958 г. падалі заявы ў прафесіянальныя ды сярэднія школы, паступілі стопрацэнтна. Гэта здарылася ўпершыню ў гісторыі школы.

Бібліятэка налічвала тады дзве тысячы кніжак. Найбольш кніжак прачыталі вучні IV класа, што ў пераліку на аднаго чытача склала 11 кніжак.

У 1959/1960 годзе да кола настаўнікаў (12 чалавек) далучылі Зінаіда Бурыла і Віктар Кабац. Былі стораны вучнёўскія самаўрады. Арганізавалася каманда гарцэраў і была ўсталявана „скрынка запытаў". З'явілася праблема слабых вынікаў навучання і вучняў, якія паўтаралі клас. Гэта тлумачылася тым, што многія настаўнікі хварэлі. Марыя Шостак падалася ў аздараўляльны водпуск. У школе стварылася раздражняльная атмасфера на глебе веравызнання. У гэтым годзе абакралі фізічны кабінет. Забралі школьныя дапаможнікі. Брак было школьнага самаўрада, а класныя працавалі неакуратна.

У 1960/1961 годзе настаўніцкія кадры папоўнілі Вольга Пацэвіч, Янка Назарук і Крыстына Хоман. 25 жніўня 1960 года педагагічная рада з бацькоўскім камітэтам рашылі, што школа будзе мець свецкі характар, а навучанне рэлігіі будзе адбывацца па-за школай. Аднак у гэтай справе ў бацькоў не было аднадумнасці. Асноўнай мэтай было павышэнне ўзроўню навучання і асабістай гігіены вучняў. Бацькоўскі камітэт абавязаўся правяраць школьнікаў у публічных месцах (кінатэатр, вясковыя святліцы і клубы, чыгуначная станцыя, наваколле гандлёвых пунктаў) і аб дрэнных паводзінах паведамляць школу.

У сакавіку 1961 года бацькоўскі камітэт абавязаўся забяспечыцца матэрыяламі і пахадайнічаць за пракладкай водаправода ў школу ў наступным годзе. На заканчэнне школьнага года прызначыў 900 зл. на ўзнагароды для вучняў і на развітальную вечарыну. Прапанавана ўзнагародзіць дваццаць выдатнікаў.

16 красавіка адбыліся выбары ў парламент і гмінныя самаўрады. У школе арганізавалі выбарчы ўчастак.

У 1961/1962 годзе пачынаюць працу Ніна Бірылка (выпускніца настаўніцкай студыі, навучала біялогіі), Яўген Давідзюк (таксама выпускнік СН — навучаў рысунку і ручным работам), Стэфан Шыманскі, Ніна Аксюціч, Феліцыя Кубацкая, Сафія Гаўрылюк і В. Ляўчук. На пенсію адышлі Стэфанія Сахацкая, Вераніка Плахта і Зінаіда Бурыла. У снежні перад канікуламі ўспыхнуў пажар. Ад коміна прадшколля загарэлася пілавінне, якім былі забяспечаны перад марозам водаправодныя трубы. Вучні былі выведзены са школы без панікі.

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Аскара Уайльда.

1. злакавы конскі ласунак = 44 _ 45 _ 19 _ 20 _;
2. чатырохасабовая (два на два) карцёжная гульня калодай з 52 карт = 23 _ 24 _ 25 _ 26 _ 13 _;
3. родны горад Іосіфа Джугашвілі = 8 _ 9 _ 6 _ 7 _;
4. плоская частка паверхні геаметрычнага цела = 34 _ 43 _ 46 _ 18 _ 22 _;
5. штучнае абвадненне зямель = 28 _ 32 _ 33 _ 38 _ 37 _ 21 _ 48 _ 29 _;
6. муж пані = 5 _ 14 _ 15 _;
7. іржышча = 31 _ 35 _ 36 _ 1 _ 2 _;
8. італьянскі горад над Адрыятыкай, насупраць Сан-Марына = 39 _ 40 _ 41 _ 42 _ 47 _ 30 _;
9. грызун сямейства мышыных (*Cricetus cricetus*) = 12 _ 4 _ 3 _ 49 _ 27 _;
10. гмінная мясцовасць між Орляй і Нарвай = 16 _ 17 _10 _ 11 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 31 нумара

Абама, аер, Асвея, бык, венік, жыд, зад, Інд, Ішым, лета, Піна, цюлень, цюль.

Рашэнне: **Бываюць людзі, якім веданне латыні не перашкаджае быць асламі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

РЭПАРТАЖ ПРА КРЫЖ, БЕЛАРУСКІЯ ПЕСНІ І ДОБРАГА ПАНА ВОЙТА!

Айцец Уладзімір Місеюк, айцей Аляксандр Клімук з матушкай Людмілай, дачкой Магдай і ўнукам Піліпком

(пачатак у 33 н-ры)

Пасля імшы ў касцёле заставалася яшчэ дваццаць хвілін, і каб збіць час, я падчапілася да стройных пагранічнікаў, якіх начальства выправіла ў ролі прадстаўнікоў на гміннае мерапрыемства. Якраз з-за пабудовы пагранзаставы, у Шудзялаве пабольшала праваслаўных душ. Мае субяседнікі на пытанне, колькі ў іх артадоксаў, адказалі па-жаўнерску: *Jest kilku.* Падобны адказ пачуўся і пра міжканфесійнае сужыццё: *Normalnie jest!*

— А што значыць назоў вашай футбольнай каманды „Судова”? — мне чамусьці здавалася, што кожны малады мужчына будзе цікавіцца спортам.

— Пра гэта спытайцеся ў нашага войта, — параілі мне ахоўнікі мяжы.

— Ён, напэўна, будзе ведаць.

Шудзялаўская „Судова” ўразіла мяне сваім лагатыпам, які сам па сабе падобны да долара з наміналам „СУК”. Як мы ўжо гаварылі, пад такім псеўданімам друкаваўся ніўскі карэспандэнт Эдвард Шчасновіч. З падобнага кораня бярэ свой назоў навакольная вёска Сукавічы. Паводле Сакрата Яновіча, гэтае слоўца дасталася нам у спадчыне ад яцвягаў і абазначае яно „скрыжаванне дарог”. Калі чалавек прыстане на скрыжаванні вуліц Банкавай і Цэнтральнай, ля экуменічных крыжоў, якраз і ўбачыць указальнік на Сукавічы. У падобных месцах лягчэй закрануць прамоўчаныя пытанні, наклікаць адкрытасць .

— Вы таксама ўмееце размаўляць папросту? — спытала я пагранічнікаў у белых, летніх формах. Апошняе пытанне наклікала свойская карцінка. Побач на лавачцы прыселі дзядзькі і не звяртаючы на нас увагі гаманілі сабе на сакавітай беларушчыне...

— Тут інакш не разгаворышся, — адказаў адзін з іх. — Я сам родам з-пад Янава і ў нас па-просту размаўляюць адно старэйшыя бабулькі. А тут — усе. А ўжо ў вёсках ля граніцы то і не пачуеце польскай мовы, нават маладыя ды дзеці шпараць па-просту...

— То ёсць у тых вёсках яшчэ дзеці? — здзівілася я.

— *No, nie za bardzo!*

Шудзялаўская — адна з найменшых і найслабей населеных гмін Падляшша. На квадратны кіламетр тут выпадае адно 14 чалавек, якіх усіх разам 650. Шляхецкія аколіцы і вёскі ахінуў працэс адмірання. У гміне працуе яшчэ дзве школы, праўда, тая ў Бабіках, дзе вядзецца навучанне беларускай мове, ад пяці гадоў ужо змагаецца за сваё існаванне. Каб пазбіраць дзетак з немалой тэрыторыі гміны і давезці на час на ўрокі, школьныя аўтобусы курсуюць ад рання да ночы.

— Ды ў „Судове” футбалісты ўжо выпісаныя з імпарту, — дадаў іншы пагранічнік родам з Шудзялава. — Хтось даязджае з Чорнай-Беластоцкай, хтось з Саколкі, а яшчэ іншы — з Супраслі...

Так ці інакш, народ не здаецца. Пад яцвяжскай шыльдай „Судовы” дзейнічаюць дзве футбольныя каманды: юнакоў і сеніёраў, працуюць лёгкаатлетычная каманда і гурток шахматыстаў. Дзень да майго прыезду, калі пачыналіся Дні Шудзялава, у гміне здорава пастралялі. Да конкурсу стральбы, які арганізавалі тут ужо сёмы раз, прыступіла ажно 28 удзельнікаў. Перамаглі Рэната Чабан-Тарасэвіч і Анджэй Юрылік. Мясцовая прэса не забылася спытаць пана войта — а чаму ён сам не прыступіў да конкурсу страляння? Гаспадар гміны меў адказаць ім прыблізна так: замест цаляць, мне лепш паглядзець як іншыя гэта робяць.

* * *

У час гутаркі з ахоўнікамі польска-беларускай мяжы я распытала пра найбольш вабныя месцы ў наваколлі. Гмінны сайт рэкламуе чамусьці адны ветракі.

— А бачылі вы новую плябанію праваслаўнага ксяндза з Вострава? — спытаў адзін з хлапцоў.

— Вядома, бачыла, гасцявала ў іх, была ўсярэдзіне, аглядала пакоі.

— Я то ўсярэдзіне не быў! — у голасе майго субяседніка адчувалася нешта як зайздрасць. — Але калі праязджаю ноччу і там гарыць святло, то хочацца спыніцца і бясконца глядзець на гэты прыгожы дом.

Магчыма, падобны будынак дзесьці пад Варшавай ці нават пад Беластокам не выклікаў бы такога захаплення, як у Востраве ці Шудзялаве. Будоўля ў стылі шляхоцкага двара на фоне хатак-небагатак явіцца як казачны палац. Я сама, больш як пра будынак, люблю думаць пра гаспадароў плябаніі. Пра іх адкрытасць і пашану для „Нівы” і роднага слова. Па запрашэнню матушкі Людмілы, 18 чэрвеня г.г. у плябаніі-двары мы ў адборнай спявача-паэтычнай кампаніі працягвалі адзначаць гадавіну смерці кампазітра Яна Тарасевіча, раней наведаўшы Саколку і Крынкі. Ужо на змярканні матушка прапанавала паглядзець царкву. Гэты сціплы звонку будынак сваім унутраным хараством напамінае душы мясцовых людзей. Царква адрозніваецца ад сваіх падляшскіх сястрыц сугучнасцю колераў і радзіннай метафізікі. Чырвона-залатыя фрэскі прамаўляюць як непадманны голас любові, іх сіла і прыгажосць прыкоўваюць да сябе як геніяльныя карціны перад якімі стаіш як укапаны і няма сілы адысці. Мы таксама прыселі на лавачцы і сузіралі, як са змроку выплываюць воблікі святых на іконах і сценах. Царкву аздобілі мінскія мастакі, між іншым Пятро Русак і Хведар Драгун. Я спытала ў матушкі пра царкоўны хор. У такім інтэр'еры, здавалася мне, голас гучыць прыгажэй і больш малітоўна.

— Мілыя мае! — матушка Людміла ўпусціла слязу. — Як вам адказаць на такое пытанне? Няма ў нас хору...

— Як няма?!

— А так! Бацюшка служыць, я спяваю. Калі ў хаце дочкі, дапамагаюць спяваць. Тады ў нас хорык. Няма людзей. Асталася нас жменька, ды тыя пераважна пажылыя і схварэлыя. Ледзь да царквы дабяруцца...

Інтэр'ер Свята-Успенскай царквы ў Паўночным Востраве можна паглядзець на віртуальных фатаграфічных галерэях ў Інтэрнэце як асаблівасць Падляшскай зямлі.

* * *

Крыж у Шудзялаве паставілі па ініцыятыве айца Аляксандра і матушкі Людмілы з Вострава. На асвячэнне прыехаў сакольскі дэкан айцец Уладзімір Місеюк. Раней, калі ішлі сюдою пілігрымкі з Саколкі і Гродна, паломнікі спыняліся якраз за гэтым скрыжаваннем, маліліся.

— Гэтыя два хрысціянскія крыжы напамінаюць нам пра пакуты і ўваскрэсенне нашага Хрыста, — пачаў натхнёную прамову сакольскі настаяцель-паэт. — Сёння ў нас Уваскрэсенне. Мы адчуваем як адраджаецца штось добрае. Кожны, хто будзе сюдою праходзіць, будзе хрысціцца адначасова ля свайго крыжа і крыжа свайго суседа. Абодва крыжы гавораць нам пра адно: яны абодва з'яўляюцца неад'емнай часткай гэтай зямлі, зямлі, дзе часам людзі ў сваёй запальчывасці лічылі адзін крыж непатрэбным...

У апошняй фразе многія прызвалі вобраз разбуранай царквы ў цэнтры Шудзялава. Пра яе інфармуе ўжо гмінны сайт, у публікацыях можам пабачыць здымак...

— Сёння побач сябе стаяць два крыжы, — гаварыў айцец Уладзімір. — Крыжы дзвюх грамадскасцей. І хаця адна з іх меншасць, Гасподзь Бог хацеў бы бачыць іх спалучанымі ў любові і сардэчнасці, як адну сям'ю. Бо толькі адна любоў здольная будаваць трывалыя падмуркі грамадскасцей...

(працяг будзе)

29.08 — 04.09

(22.03. — 20.04.) У некаторых справах разлічвай толькі на сябе. Нечаканыя абставіны прыгадаюць сітуацыі з твайго мінулага; можа, раней ты штосьці страціў ці не выкарыстаў нагоды? Дапрацуй работу. Вялікая імпульсіўнасць. Напружаныя дні: 3 і 4.09.

(21.04. — 21.05.) Магчымыя сустрэчы са сваімі былымі. Можаш вярнуцца і да творчых праектаў; праяві большую руплівасць да работы. Перапрацоўкі ў справах, стасунках і выглядзе. Слухай парад. Можаш разлічваць на паправу старой памылкі.

(22.05. — 22.06.) Адны дзверы перад табою адчыняцца, іншыя зачыняцца. На першае месца выйдуць хатнія справы, хоць чакаюць цябе прыемныя навіны ў кар'еры, магчымасць заззяць перад большай публікай і іншым полам. Ды лідарства ўступі камусьці іншаму. Добрыя дні: 1 і 2.09.

(23.06. — 23.07.) Твая прыродная воля змагання будзе крыху цяжкаватая для іншых. Ды прыйдзецца адваёўваць пазіцыі. Перашкоды магчымыя для пераадолення. Паклапаціся за сябе, кінь чужыя праблемы. Не выбірайся ў даўжэйшае падарожжа. Добрыя дні: 3 і 4.09.

(24.07. — 23.08.) Будзь уважлівы да ўсёй наплываючай інфармацыі. Верагодныя блытаніна і чысты абман. Справы з маёмасцю пойдуць ладна (ды лепш не рабі вялікіх пакупак). Любоўныя прыгоды з фантазіяй — на ўвесь верасень!

(24.08. — 23.09.) Эмацыянальная няўстойлівасць, хоць магчымыя прыемныя сюрпрызы ў асабістым жыцці. Займіся аналізам сваіх паводзін. Удалыя пакупкі, магчымая паправа ў матэрыяльным плане. Напружаныя дні: 1 і 2.09.

(24.09. — 23.10.) Невялікая ахвота на тлумныя імпрэзаванні. У верасні будзь гатовы да розных нечаканасцей на рабоце. Што б там ні адбывалася, можа гэта адкрыць перад табою новыя перспектывы. Могуць выплысці сітуацыі, нявырашаныя раней. Добры час на медыцынскія агляды. Пільнуйся ўвесь верасень: магчымыя траўмы! Добрыя дні: 1 і 2.09., напружаныя: 3 і 4.09.

(24.10. — 22.11.) Паспяховая праца над новымі праектамі. Прааналізуй планы на будучыню. Праніклівасць не дасць табе трапіць у пастку. Рамантычныя прыгоды; нечаканыя і незвычайныя сустрэчы, а таксама сустрэчы са старымі сябрамі ў рэальнасці і ў сеціве. Добрыя дні: 3 і 4.09.

(23.11. — 22.12.) Нечаканыя падзеі ў доме, перамены ў сям'і. Будзь гатовы да сюрпрызаў. На працы стараннi для кар'еры могуць быць малаэфектыўнымі. Усё, што зробіш у верасні, будзе прыўкрашана любоўю і далікатнасцю. Можаш сустрэць старую любоў. Чаргуй актыўнасць з адпачынкам. Напружаныя дні: 1 і 2.09.

(23.12. — 20.01.) Час яснасці: хто сябра, хто праціўнік, якая справа прынясе поспехі. Знаёмствы з незвычайнымі людзьмі; нецікавыя, здавалася б, знаёмствы могуць аказацца вельмі перспектыўнымі і карыснымі сувязямі. Лепш не выбірайся ў далёкую дарогу. Напружаныя дні: 3 і 4.09.

(21.01. — 19.02.) У апошнія дні жніўня чакае цябе прэзент ад лёсу! У верасні магчымае вяртанне страчаных грошай, падарункі. Але не рабі новых даўгоў! Час напругі, патрабуючы сабранасці і ўпору. Добрыя дні: 1 і 2.09.

(20.02. — 21.03.) Працяг павышанай актыўнасці. Поспехі магчымыя ў калектыўных праектах і іміджавых пытаннях. Можаш штосьці спраўна змяніць у сваім выглядзе. Вырашы старыя праблемы ў асабістых і службовых справах. Магчымае мірнае завяршэнне спрэчкі. Высокая актыўнасць у каханні. Добрыя дні: 3 і 4.09., напружаныя: 1 і 2 верасня.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960